# Філаматы

**Бюлетэнь
Рэспубліканскага
грамадскага
аб’яднання
«Таварыства
аматараў
ведаў (філаматаў)»**

**№ 1(4)
2003**

Галоўны рэдактар Юрый Хадыка

Таварыства аматараў ведаў (філаматаў) выказвае падзяку Праграме малых праектаў Амбасады Каралеўства Нідэрланды за дапамогу ў выданні матэрыялаў для сяброў Таварыства і выпускнікоў Народнага універсітэта.

© Таварыства аматараў ведаў (філаматаў), 2003

# ПАВАЖАНЫ ЧЫТАЧ!

Пасьля даволі працяглага перапынку мы аднаўляем выданьне Бюлетэня Народнага універсітэта. Матэрыялы, змешчаныя ў чарговым нумары, адрасуюцца найперш сябрам зарэгістраванага 20 лістапада 2002 года Таварыства аматараў ведаў (“Філаматаў”). Аднак, без сумнення, яны будуць карысныя кожнаму зацікаўленаму чытачу, які жадае лепш арыентавацца ў палітычных і сацыяльных праблемах нашай краіны. Як звычайна, мы публікуем аналітычныя артыкулы па паліталогіі, эканоміцы, беларускай гісторыі і культуры, а таксама іншых актуальных і надзённых пытаннях.

У гэтым нумары Вам прапануецца грунтоўны допіс Уладзімера Роўды прасучаснае разуменне сутнасці нацыяналізму. У ім развенчваюцца міты, народжаныя агрэсіўным шавінізмам пануючай нацыі, – тыя, што насаджаліся савецкаю прапагандай і сістэмай адукацыі. Насамрэч, нацыяналізм – светапоглядная канцэпцыя народаў дэмакратычнай Еўропы. Ён не замінае інтэграцыі краінаў у эканамічнай, ваеннай, палітычнай сферах. Але ён дапамагае ашчадна захоўваць і развіваць нацыянальна-культурныя адметнасці кожнага народа.

Антон Слонімскі прэзентуе вынікі сацыялагічнага апытання, праведзенага сярод людзей, якім лёсіла звязаць сябе з прыватнай вытворчасцю. Высвятляюцца асаблівасці і перашкоды ў развіцці малых прадпрыемстваў Беларусі. Нягледзячы на тое, што апытанне было праведзенае ў 1997—1998 гг., ягоная актуальнасць і цікавасць не зніклі. Рэфармаванне і ўпарадкаванне гэтай сферы адбываецца надзвычай павольна.

Артыкул Аляксея Хадыкі прысвечаны гісторыі прыватнай мастацкай калекцыі з Росі. Яе складанне звязанае з імёнамі прадстаўнікоў славутых родаў Хадкевічаў, Глябовічаў, Агінскіх, Патоцкіх. Мастацкія каштоўнасці роскай калекцыі падзялілі тыповы лёс прыватных збораў у Беларусі. У час ліхалецця – першай сусветнай вайны – яны былі вывезеныя з нашай радзімы і назад ужо не вярнуліся. Фактычна ў артыкуле ўздымаецца пытанне аб рэстытуцыі помнікаў беларускае культуры – вяртанні іх пранамсі ў інфармацыйным плане ў гістарычную памяць беларусаў.

Вядомаму расійскаму праваабаронцу айцу Глебу Якуніну належыць артыкул “О праве человека на свободу совести в современной России”, які аднаўляе падзеі, што мелі месца ў Расіі яшчэ ў 1997 г. Ягоная цікавасць для айчыннага чытача тлумачыцца дзвюма прычынамі. Першая заключаецца ў тым, што нядаўна прыняты беларускі закон, які

рэгламентуе дзейнасць рэлігійных канфесіяў, амаль не адрозніваецца ад расійскага. Па-другое, настойлівая прапаганда неабходнасці саюзнай дзяржавы сведчыць пра тое, што ў перспектыве розніцы можа не быць наогул. Памылкі, зробленыя нашымі суседзямі 6 гадоў назад і ўжо тады відавочныя тым, хто цвяроза разумее сітуацыю ў расійскай дзяржаве, пераносяцца на беларускую глебу. Ці разумна знаходзіць агульнае паміж беларускім і расійскім народамі ў агульных памылках і бедах?

Ад 1917—1918 гадоў, часу юрыдычнага афармлення дзяржаўніцкага кампанента сучаснай беларускай нацыі, цягнецца след і пераемнасць намагання вырашаць беларускія справы без спадзявання на добрага суседа. 100-годдзе В. Жук-Грыцкевіча, старшыні Рады БНР у замежжы ў 1971—1982 гг., адзначанае сёлета 10 лютага, дало падставу Леаніду Лычу прасачыць лёс гэтага неардынарнага чалавека. Ідэя беларускай дэмакратычнай дзяржаўнасці, захаваная беларускім замежжам, дапамагла нанова адрадзіцца сучаснай незалежнай Беларусі.

Выказваем надзею, што нашыя сябры не застануцца абыякавымі да закранутых на старонках часопіса тэмаў. Запрашаем Вас да супрацоўніцтва – мы гатовыя даць месца для дыскусійных каментараў і аўтарскіх матэрыялаў. Вельмі чакаем таксама інфармацыі пра дзейнасць суполак Таварыства Філаматаў. Дасылайце карэспандэнцыю:

220012, г. Мінск, вул. Талбухіна, д. 17, кв. 16.
Тэл./факс (017) 266-07-97
Электронная пошта: p_university@open.by

*Юрый Хадыка,*
рэдактар

*Уладзімер Роўда*

# Канцэпцыі паходжаньня нацыяналізму

Якім чынам узнікае нацыяналізм: ці зьяўляецца яго фармаваньне неабходнасьцю, ці гэта – чыстая выпадковасьць; ці існаваў ён заўсёды, ці ўяўляе сабой атрыбут мадэрнізацыі і адрозную асаблівасьць сучаснага грамадзтва?

## Пастаноўка пытаньня: неабходнасьць ці выпадковасьць?

Калі нацыяналізм унівэрсальны і вечны, тады, напэўна, ён – неабходнасьць, неад'емная ўласьцівасьць прыроды чалавека, псыхалёгіі і грамадзкіх дачыненьняў. Менавіта так разглядаюць сябе і свой статус многія нацыяналісты. Цікава што, дадзены статус вельмі часта прыпісваецца нацыяналізму ягонымі праціўнікамі. "Туманістычныя інтэрнацыяналісты", якія ганьбуюць партыкулярызм, выключнасьць, адсутнасьць талерантнасьці, вузкасьць і жорсткасьць нацыяналізму, тым ня менш, з вялікім шкадаваньнем прызнаюць, што гэтыя рысы глыбока ўкарэненыя і ўнівэрсальна ўласьцівыя чалавечаму розуму і сэрцу. Яны па-фарысейску выстаўляюць сябе як людзей, якія вядуць цяжкую і невыносную барацьбу з атавістычнымі, але ўсё роўна, магутнымі тэндэнцыямі развіцьця чалавечай сьвядомасьці. Яны імкнуцца пераадолець гэтыя тэндэнцыі, але прызнаюць іхную сілу і ўсюдыіснасьць; спадзяюцца, што адкрытасьць, добрапрыстойнасьць і ўсеагульнае братэрства перамогуць, але глыбока занепакоеныя сілай супрацьлеглых тэндэнцыяў.

Э. Гелнэр выражае скептыцызм адносна прыпісаных нацыяналізму і нацыянальным пачуцьцям унівэрсалізму, з аднаго боку, і ўяўленьняў аб барацьбе ў духу маніхейства між "атавістычным партыкулярызмам" і "асьвечаным унівэрсалізмам", з другога. Ён адмаўляе і зьвязаную з гэтымі поглядамі так званую "тэорыю сну", якая высоўваецца некаторымі нацыяналістычнымі мысьлярамі. Дадзеная дактрына імкнецца прымірыць прыпісаную нацыяналізму ўнівэрсальнасьць зь неаспрэчнымі фактамі ягонай яўнай адсутнасьці на гістарычнай авансцэне напрацягу многіх стагодзьдзяў. Яна настойвае на гераічнай ролі абуджальнікаў нацыянальных пачуцьцяў (1).

Нацыяналісты ў большасьці сваёй вырашаюць гэтую супярэчнасьць шляхам сцьвярджэньня, што нацыяналізм быў у сапраўднасьці заўсёды, але спаў. Наша нацыя заўсёды была тут; яна вечная, непераможная, выходзіць за рамкі эфэмэрных істотаў і пакаленьняў, у якія яна была ўвасоблена. Асноўны будаўнічы матэрыял чалавецтва – гэта нацыі і іхнае існаваньне – гэта не выпадковы і не маральна неістотны факт, але, наадварот, ён мае цэнтральнае значэньне для самарэалізацыі чалавечай асобы.

Гэтая тэорыя небясьпечная, ў першую чаргу, для самога нацыяналізму тым, што відавочны статус, які яна прыпісвае сабе і які прыпісваецца ёй, робіць тых, хто прытрымліваецца дадзенага пункту погляду няздольнымі пабачыць, што яны ўвогуле прытрымліваюцца нейкай тэорыі. Яны ня бачаць, што іхныя погляды зьяўляюцца спрэчнымі і іх трэба праверыць, бо лічаць іх – натуральнымі і ўнівэрсальнымі. Яны думаюць, што проста прызнаюць нешта само сабой зразумелым і не тэарэтызуюць на гэты конт. Тое ж, што не ўспрымаецца як прадмет дыскусіі, ня можа быць выпраўлена.

Скрайняй альтэрнатывай надзяленьня нацыяналізму рысамі неабходнасьці зьяўляецца супрацьлеглы пункт погляду, які разглядае яго як выпадковасьць, вынаходніцтва, другасны прадукт напісаных групай мысьляроў твораў у пэўнай гістарычнай сытуацыі. Гэты пункт погляду найбольш поўна выкладзены французскім навукоўцам Эліем Кедар'е ў адной зь ягоных апошніх працаў – "Нацыяналізм" (2). Узьнікла цэлая школа, якая разглядае нацыяналізм як зьяву хутчэй суб'ектыўнага, чым аб'ектыўнага характару, прадукт творчасьці інтэлектуалаў і палітыкаў, якія выкарыстоўвалі гэтую ідэю ў сваіх карысьлівых інтарэсах. На думку аднаго з найбольш яскравых прадстаўнікоў гэтай школы – Бэнэдыкта Андэрсана – "нацыянальнасьць як і нацыяналізм, зьяўляюцца культурнымі артэфактамі асаблівага віду… Мы можам дапусьціць, што фармаваньне дадзеных артэфактаў да канца XVIII ст. было выклікана шэрагам складаных гістарычных перадумоваў, якія перасякаюцца. Асабліваe месца сярод іх займае "пісьмовая мова", якая адказная за вынаходніцтва нацыяналізму, а ня нейкія канкрэтныя мовы народаў" (3).

На нашую думку, Андэрсан і ягоныя пасьлядоўнікі спыняюць сваю ўвагу на вельмі важным аспэкце экзыстэнцыі нацыянальных супольнасьцяў: ролі суб'ектыўнага і нават, калі хочаце, мітатворчага фактару ўва ўзьнікненьні і разьвіцьці нацыяў. Сапраўды, пісьменьнікі, мастакі, гісторыкі, журналісты адыгрываюць важную творчую ролю ў фармаваньні і распаўсюджаньні нацыянальнай самасьвядомасьці, ператвараючы зь ягонай дапамогаю аморфную этнічную супольнасьць у палітычна актыўную нацыю, якая ўсьведамляе свае мэты і задачы і аддзяляе сябе ад іншых. Аднак рабіць гэта яны могуць не пры дапамозе чароўнай палачкі, не ў любы час і не ў любым месцы. Трэба, каб склаліся аб'ектыўныя ўмовы, спрыяльныя для гэтай дзейнасьці, быў у наяўнасьці народ, здольны на праяву "волі да прыналежнасьці". Якія гэта ўмовы, і пры якіх абставінах





народ ператвараецца ў нацыю, а ягоная стыхійная барацьба за паляпшэньне матэрыяльнага дабрабыту – у мэтанакіраваны і часта зьвязаны з шчырай самаахвярнасьцю нацыяналістычны рух? Адказаць на гэтыя пытаньні валюнтарысцкі накірунак ня ў сілах.

Мы згодныя з Гелнэрам, які адмаўляе кожную з гэтых палярных пазыцыяў. "Нацыяналізм не зьяўляецца ні ўнівэрсальнай і неабходнай зьявай, ні выпадковым і пабочным прадуктам, плодам пустаслоўя і лёгкаверных чытачоў. Ён уяўляе сабой неабходны вынік ці знаходзіцца ў пэўнай сувязі з пэўнымі сацыяльнымі ўмовамі, якія, так здарылася, зьяўляюцца нашымі ўмовамі і яны таксама вельмі шырока распаўсюджаны, глыбокія і ўсеахопныя" (4).

Нацыяналізм зусім не выпадковасьць: ягоныя карані глыбокія і важныя, ён стаў у сапраўднасьці лёсам нашых сучасьнікаў, а ня нейкай разнавіднасьцю заразнай хваробы, якая зьявілася на сьвет у эпоху позьняй асьветы. Але, зь іншага боку, глыбокія карані, якія выклікалі яго, не ўнівэрсальныя і таму нацыяналізм не зьяўляецца ўсеагульным лёсам народаў. Задачай навукі зьяўляецца выдзяленьне тых парамэтраў, якія аддзяляюць схільныя да нацыяналізму грамадзтвы ад тых, якія яму супрацiўляюцца. Гісторыя сьведчыць, што з канца XVIII ст. узрослая прапорцыя чалавецтва, верагодна, да нашага часу – ягоная пераважная большасьць, адносіцца да першага лягеру.

Унівэрсальнымі фактарамі чалавечага існаваньня зьяўляюцца культура і арганізацыя. Людзі заўжды жылі ў межах той ці іншай культуры. Ува ўсе часы і ў любым месцы нашай плянэты яны адрозьніваюцца між сабой мовай, стылямі прамаўленьня, мімікай, жэстыкуляцыяй, адзеньнем, упрыгожваньнямі, спосабамі прыгатаваньня ежы і г.д. Культурная разнастайнасьць – гэта галоўная рыса чалавечай цывілізацыі, якая адрозьнівае людзей ад жывёльнага сьвету. Наяўнасьць культуры без сумніву мае пад сабой генэтычную аснову. Вядомы амэрыканскі антраполяг Наам Хомскі абгрунтаваў гэтую выснову дасьледваньнямі здольнасьцяў людзей авалодваць мовамі (5). Калі ягоныя доказы распаўсюдзіць на ўсю культуру, то атрымаецца, што здольнасьці да культуры маюць аднолькавыя для ўсяго чалавецтва генэтычныя перадумовы. Але прысутнасьць культуры ўплывае на тое, што перадача яе ад пакаленьня да пакаленьня вызваляе людзей ад гэтай генэтычнай залежнасьці, дазваляе дасягнуць значна большай разнастайнасьці і варыятыўнасьці. Разам з тым, нашая здольнасьць да набыцьця культуры не дыктуе таго, якой гэтая культура павінна быць. Гісторыя чалавецтва мае шэраг прыкладаў калі пад узьдзеяньнем эканамічных ці палітычных умоваў цэлыя народы мянялі свае месца жыхарства, мову, рэлігію і г.д.

Чалавечаму грамадству ўласьцівым зьяўляецца не толькі валоданьне культурай, але і наяўнасьць арганізацыі. Людзкія істоты ў любой групе адрозьніваюцца па ўзросту і полу, прафесійнай дзейнасьці, ступені адукаванасьці, сацыяльнаму становішчу і г.д. Група лю-

дзей уяўляе сабой не нейкую арыфметычную суму індывідаў, а ў першую чаргу, асацыяцыю, у якой адносіны людзей адзін да другога залежаць ад роляў, якія імі выконваюцца, пэўных інтарэсаў і чаканьняў, правоў і абавязкаў, прывілеяў і абавязацельстваў.

Гэтыя дзве асноўныя характэрыстыкі: культура і арганізацыя зьяўляюцца галоўнай сыравінай ўсяго сацыяльнага жыцьця, зь якога паўстаюць усе астатнія грамадзкія формы. Часам сацыяльная арганізацыя дамінуе над культурай, часам жа бывае наадварот. Напрыклад, у выніку Вялікай францускай рэвалюцыі XVIII ст. узьнікла новая эгалітарная форма арганізацыі, якая паўплывала на культуру, забараніўшы ўжываць арыстакратычныя тытулы і ўвёўшы строгія правілы па адзяленьню царквы ад дзяржавы. Зь іншага боку, індуісцкая культура робіць непазьбежным жорсткі падзел грамадзтва на касты. Гэты спосаб сацыяльнай арганізацыі дажыў да нашых дзён, хаця ён і праяўляецца ў новых грамадзка-палітычных умовах Індыі. Аналягічным чынам, мы можам сказаць, што цывілізацыі Усходу прапанавалі культурны адказ на арганізацыйны выклік Захаду, зь якім яны сутыкнуліся, пачынаючы з XVI стагоддзя. Гэты адказ зводзіўся да выбару адной з чатырох асноўных стратэгіяў паводзінаў: ізаляцыянізм, вэстэрнізацыя культуры разам з мадэрнізацыяй эканомікі, мадэрнізацыя эканомікі без вэстэрнізацыі культуры, вэстэрнізацыя культуры без мадэрнізацыі эканомікі. Аднак, як гэта добра вядома, арганізацыйны выклік і экспансія Захаду былі б немагчымымі без ягоных нутраных культурных пераўтварэньняў: Рэнэсансу, руху Рэфармацыі, навуковай рэвалюцыі, руху Асьветы і г.д.

Паколькі нацыяналізм зьяўляецца палітычным прынцыпам, які патрабуе каб аднастайная нацыянальная культура была асновай сацыяльных сувязей, мы павінны шукаць у розных грамадзствах і на розных этапах іхнага існаваньня такое ўзаемаспалучэньне культуры і арганізацыі, якое б рабіла гэты прынцып цалкам натуральным і легітымным. Іншымі словамі, нацыяналізм становіцца магчымым і эфектыўным палітычным прынцыпам калі ў грамадзтве ўзьніклі і дасягнулі пэўнай ступені сьпеласьці сацыяльныя патрэбы ў інтэграцыі людзей вакол культуры, калі самі гэтыя людзі ўсьведамляюць сябе як яе носьбітаў і стваральнікаў, і калі яны імкнуцца, ў бальшыні сваёй, да палітычнага самавызначэньня ў межах нацыянальнай дзяржавы.

Той факт, што магутная прысутнасьць нацыяналізму ў душах многіх людзей абумоўлена пэўнымі сацыяльнымі ўмовамі, наколькі б не былі яны важнымі і шырока распаўсюджанымі, стварае ўражаньне, што гэта – рэдукцыяністкая тэорыя, якая апускае нацыянальныя пачуцьці да эмацыйнай маніфэстацыі сацыяльных дачыненьняў. Гелнэр указвае, што нават адносна мяккія людзі, якія прытрымліваюцца гуманістычных каштоўнасьцяў і ўмераных нацыяналістычных поглядаў, адчуваюць па меншай меры раздражненьне ад такой прапановы, якая, на іхную думку, зьяўляецца зьневажальнай. Яны любяць





сваю краіну, свой народ і сваю культуру. Іхная любоў зьяўляецца шчырай, глыбокай і бескарысьлівай. Яна дапамагае ім і іхным знаёмым узьняцца да ўзроўня альтруізму і самаахвярнасьці, на якія яны пры іншых абставінах былі б няздольныя. Таму яны незадаволеныя зьвядзеньнем іхных добрых, не эгаістычных, самаахвярных пачуцьцяў да ўзроўню наступстваў дзеяньня сацыяльных сілаў.

Гелнэр называе такую незадаволенасьць натуральнай і зразумелай, але, зь ягонага пункту погляду, не абгрунтаваным. “Пачуцьці могуць караніцца ў сацыяльных умовах і выклікацца імі: гэта ня робіць іх ня шчырымі, не сапраўднымі, яны ня могуць не прыводзіць да гераічнай самаахвярнасьці. Наадварот, небясьпечным для нацыяналістаў зьяўляецца настойваньне на тым, што іхныя нацыянальныя, патрыятычныя пачуцьці – шчырыя, але нічым не абумоўленыя, што яны ўзьнікаюць зь нейкай унутранай фізычнай прыроды, якая не залежыць ад уплыву сацыяльнага атачэньня. Па іроніі, гэта можа быць накіравана супраць прэтэнзіі нацыяналістаў на культурную спэцыфічнасьць, і апрача іхнай волі ператварае нацыяналізм у пан-гуманістычную плынь, якая выходзіць за межы ўсіх культураў і нацыяў” (6).

Такім чынам, тыя каштоўнасьці, якім адданыя нацыяналістычныя пачуцьці, сыходзяць сваімі карэньнямі ў фундамэнтальныя ўмовы жыцьця людзей, пранікаюць у сарцавіну існаваньня сучаснага грамадзтва. Таму абвінавачваньні ў рэдукцыянізьме, якія часта робяцца ў адрас канцэпцыі Гелнэра, ня маюць падставаў. Шчырасьць і глыбіня нацыянальных пачуцьцяў не адмаўляецца і не адкідаецца дадзенай тэорыяй. Наадварот, яны складаюць адну з ключавых перадумоваў пункту погляду Гелнэра, узятага цалкам.

## Калі ўзьнікае нацыяналізм (Дыскусія “мадэрністаў” і “прэмадэрністаў”)

Калі Гелнэр у пытаньні аб неабходнасьці ці выпадковасьці нацыяналізму займае прамежкавую пазыцыю, то па іншай важнай праблеме, зьвязанай з процістаяньнем “мадэрністаў” і “прэмадэрністаў”, ён далучаецца да аднаго з процілеглых пунктаў погляду. “Апошнія адстойваюць старадаўняе паходжаньне нацыяналізму; першыя шукаюць ягоныя вытокі ў сучасным сьвеце. Наша пазыцыя па гэтым пытаньні зьяўляецца яснай: карані нацыяналізму трэба шукаць у сучаснасьці”,— падкрэсьлівае аўтар (7).

Пад мадэрнізацыяй прынята разумець глябальны працэс асучасьнівання грамадзкіх дачыненьняў, пераходу ад традыцыйных сацыяльных структураў і каштоўнасьцяў да сучасных. С. Хантынгтан указвае, што мадэрнізацыя ўяўляе сабой “шматаблічны працэс, які ўключае ў сябе перамены ва ўсіх сфэрах чалавечай сьвядомасьці і чалавечай актыўнасьці... Асноўнымі аспэктамі мадэрнізацыі зьяўляецца ўрбанізацыя, індустрыялізацыя,

секулярызацыя, дэмакратызацыя, развіццё адукацыі, пастаянны ўдзел сродкаў масавай інфармацыі ў грамадзка-палітычным жыцьці" (8).

Мадэрнізацыя дапускае глыбокія зьмены на псыхалягічным, інтэлектуальным, дэмаграфічным, сацыяльным, эканамічным і палітычным узроўнях жыцьця грамадзтва. Вельмі важным для тэмы нашага дасьледу зьяўляюцца тыя абставіны, што мадэрнізацыя рэзка мяняе каштоўнасныя арыентацыі і падыходы людзей. Калі "традыцыйны чалавек" аддае перавагу пастаянству ў прыродзе і грамадзтве і ня верыць у здольнасьці людзей нешта радыкальна мяняць у навакольным асяродзьдзі, то "сучасны чалавек", наадварот, арыентаваны на перамены і верыць у іхнюю неабходнасьць і магчымасьць. Гэта патрабуе ад яго пашырэньня аб'ектаў ляяльнага стаўленьня і ідэнтыфікацыі: ад канкрэтных групаў, такіх як сям'я, клян, вёска да больш буйных і не пэрсаніфікаваных утварэньняў, такіх як кляса і нацыя.

"Прэмадэрнізм" (канцэпцыя дасучаснага паходжаньня нацыяналізму) сьцьвярджае, што нацыі ўнівэрсальныя і існавалі заўсёды, а нацыяналізм знаходзіў сваю праяву ў розных формах і варыянтах напрацягу ўсёй гісторыі чалавецтва. Мы ўжо разглядалі некаторыя аспэкты гэтай пазыцыі, калі гаварылі аб "тэорыі сну" і "абуджальніках". Напрыклад, славацкія нацыяналісты настойваюць на тым, што іхная нацыя напрацягу доўгага гістарычнага пэрыяду, пасьля перасяленьня славянаў ува Ўсходнюю Эўропу, займала тэрыторыю між Татрамі і Дунаем. Заўсёды існавала славацкая этнакультурная супольнасьць, якую розныя былыя імпэрыі і чужаземныя ўладары адмаўляліся прызнаваць, ненавідзелі, зьневажалі, таптáлі нагамі і г.д. Рысы гэтай супольнасьці і ейны ўнікальны дух перадаваліся з пакаленьня ў пакаленьне напрацягу стагодзьдзяў, пакуль не склаліся спрыяльныя ўмовы для іхнай актуалізацыі. Патрэбы ў камунікацыі прывялі да ўзьнікненьня пісьмовай мовы, літаратуры, школаў, богаслужэньняў на роднай мове. Сфармавалася нацыянальная інтэлігенцыя, якая пачала палітычную барацьбу супраць прыгнёту, за нацыянальныя правы, якая скончылася дасягненьнем поўнай незалежнасьці 1 студзеня 1992 году.

Аналягічна разважаюць нацыяналісты і ў іншых краінах: ад Шатляндыі да Тыбету і ад Сэрбіі да Палінэзіі. Агульным для іхных разважаньняў зьяўляецца тое, што ўсе яны схільныя разглядаць працэс станаўленьня і развіцьця канкрэтных нацыяў як натуральны і доўгі, які замоўчваецца і адмаўляецца іхнымі больш прасунутымі ў гэтым руху, "больш разьвітымі" суседзямі (у выпадку Славакіі – народамі Аўстрыі, Вугоршчыны і Чэхіі). Іншымі словамі, нацыі, перш чым стаць сучаснымі і валодаючымі дзяржаўнасьцю, праходзяць праз цэлы шэраг ступеняў развіцьця, кожную зь якіх ня трэба ігнараваць альбо недаацэньваць. Пазыцыя "прэмадэрністаў" заключаецца ў тым, што да-сучасная і самакаштоўная "этнічнасьць", зрабіла значна большы і, бясспрэчна, пазытыўны ўнёсак ў





той выбух нацыяналізму, які здарыўся ў сучасную эпоху, чым гэта прынята лічыць "мадэрністамі".

Том Нэйрн, які абараняе пункт погляду "прэмадэрністаў", выкладае ягоныя асноўныя пастуляты наступным чынам: "У некаторым сэнсе, канечне ж, нацыянальнасьці павінны былі на самой справе быць тут заўсёды, і павінны былі ўсьведамляць сваю прысутнасьць цалкам ці напалову, па меншай меры, ня спаць. Значыць, стракатасьць чалавецтва не павінна ўспрымацца як пасіўная дадзенасьць, коўдра з абрэзкаў этнічнай сыравіны, якая аказалася ў наяўнасьці, калі ўдарыла маланка мадэрнізацыі. Усе дасьледы ў галіне сацыяльнай антрапалёгіі (уключаючы раньнюю працу Гелнэра аб Паўночнай Афрыцы) паказваюць, наколькі непасіўнай была традыцыйная супольнасьць у сапраўднасьці, нават калі ейная несупынная дынаміка была ў асноўным цыклічнай і закрытай" (9).

Якім жа чынам можна зьвязаць доўгі працэс этнічнага развіцьця, які дасягае сваёй кульмінацыі ў фармаваньні нацыяў і нацыянальных дзяржаваў? Да зьяўленьня канцэпцыі мадэрнізацыі галоўнай парадыгмай этна-нацыянальных дасьледаў была так званая "тэорыя крыві", якая сьцьвярджае перадачу ў спадчыну асноўных культурных характарыстыкаў людзей з пакаленьня ў пакаленьне. Але, пачынаючы з 30-х гадоў XX ст., усё, што асацыявалася з "крывёю" стала разглядацца як адгалінаваньне расізму і нацыянал-сацыялізму, якое кепска патыхае. Усемагчымыя формы псэўданавуковага сацыял-дарвіністкага падыходу паразытавалі на гэтай тэорыі, каб абгрунтаваць і апраўдаць панаваньне адных народаў над іншымі, прыгнёт слабых моцнымі, вынішчэньне непрыстасаваных да жыцьця барбараў развітымі і "цывілізаванымі" нацыямі.

Імкнучыся пазьбегчы атаясамленьня з падобнымі антыгуманнымі і ўнівэрсалісцкімі тэорыямі, "прэмадэрнізм" падкрэсьлівае, што этнічныя адрозьненьні павінны інтэрпрэтавацца абсалютна па-іншаму. Будучы культурнымі артэфактамі, яны паддаюцца пісьмовай апрацоўцы, засваеньню праз навучаньне і перапраграмаваньню. Прэлюдыяй нацыяналізму зьяўляецца этнічнасьць, але сама яна ніколі не бывае "натуральнай", у канчатковым дэтэрміністкім сэнсе гэтага слова, як лічылі Габіно, рабаўладальнікі Амэрыканскай Канфэдэрацыі і Гітлер. Яна павінна разглядацца з сацыялягічнага, а не біялягічнага пункту погляду.

На думку Т. Нэйрна, падзеі 1989г. ува Ўсходняй Эўропе прымушаюць нас вярнуцца да "тэорыі крыві", але ў перагледжаным выглядзе. Трэба адмовіцца ад гісторыка-матэрыялістычнага падыходу, які ня толькі ўласцівы марксізму, але і навукоўцам, якія вызнаюць канцэпцыю мадэрнізацыі, бо яны імкнуцца вывесьці нацыяналізм з сукупнасьці сацыяльна-эканамічных умоваў жыцьця людзей, а ня іхнай духоўнай спадчыны. Філязофскай апазыцыяй такому падыходу зьяўляецца ідэалістычная канцэпцыя гістарычнага

развіцьця, распрацаваная Кантам, Гегелем і іхнымі пасьлядоўнікамі. Сьлепата гісторыі – зьява, якая падаецца нам, але не існуе ў сапраўднасьці, бо за кожным ейным несьвядомым крокам стаіць боская воля і наканаванасьць. Чаму б не ўяўляць сабе, напрыклад, што адрозьненьні народаў, нацыяў і расаў зьяўляецца праяваю разнастайнасьці ідэяў у гісторыі? Выбар аднаго ці іншага народу для выкананьня пэўнай ролі ёсьць толькі вынікам увасабленьня ў жыцьцё актуальнага на дадзеным адрэзку гістарычнага развіцьця вышэйшага прызначэньня. Упершыню выказаная Гегелем у ягонай філязофскай інтэрпрэтацыі гісторыі, гэтая канцэпцыя была пасьля вельмі перакручаная сацыял-дарвінізмам і арыйскім расізмам.

Нэйрн лічыць, што сучасны "прэмадэрнізм" павінен факусаваць сваю ўвагу ня столькі на біялягічных, колькі на сацыяльных фактарах перадгісторыі і эвалюцыі клянавых дачыненьняў, якія аб'ядноўваюць natus (лац. 'прырода' – заўв. аўтара) з нацыяй, і затым, пад узьдзеяньнем працэсу мадэрнізацыі, з нацыяналізмам. Конар Круз О'Браен вельмі дакладна сфармуляваў гэтую думку ў сваіх развагах аб пераемнасьці чалавечай сьвядомасьці. "Нашыя старэйшыя пакаленьні распавядаюць пра свае ўспаміны нашымі вуснамі, пакуль мы ня схопім нейкі сэнс працягласьці, які накладае адбітак на наша індывідуальнае існаваньне. Ступень, у якой мы ўсьведамляем гэты сэнс, і тая форма, якую ён прымае: нацыянальная, рэлігійная, расавая ці сацыяльная – залежаць ад нашага ўяўленьня, а таксама ад пэрсанальных якасьцяў, меркаваньняў і гаварлівасьці нашых старэйшых сваякоў. Дзеці, калі яны валодаюць уяўленьнем, могуць уключыць у сваё жыцьцё істотную часьцінку часу, які працякаў да іхнага зьяўленьня на сьвет" (10).

Іншымі словамі, нацыянальная сьвядомасьць фармуецца пад узьдзеяньнем культуры і ўяўленьня; яна адкрыта для ўзьдзеяньня, як з боку фактараў навакольнага асяродзьдзя, так і індывідуальным намаганьням, накіраваным на ўключэньне ў этнічную супольнасьць. Мы ўсе ўдзельнічаем у вызначэньні сэнсу і формы той "працягласьці", якая ідзе каранямі ў глыбокае і туманае мінулае, з аднаго боку, і фармуе сілай уяўленьня будучае, зь іншага. Таму, з пункту погляду "прэмадэрністаў", няправільна разглядаць тыя культурныя артэфакты, якія склаліся да ўключэньня працэсу мадэрнізацыі, як нешта патэнцыйнае, неістотнае і лятэнтнае для ўзьнікненьня нацыяналізму. Напрыклад, для любога чалавека, знаёмага з азамі нацыяналістычнай ідэалёгіі, абсалютна яснай зьяўляецца роля рэлігіі ў станаўленьні нацыяў і палітычнага руху за іхнае самавызначэньне. Але яна амаль зусім не апісваецца ў канцэпцыі мадэрнізацыі, хіба што ў выглядзе сілы, альтэрнатыўнай нацыяналізму і выступаючай нейкім сурагатам нацыянальнай ідэнтычнасьці.

Такім чынам, "прэмадэрнісцкая" тэорыя настойвае на існаваньні цэлага шэрагу фактараў, якія разьвіваліся напрацягу ўсёй гісторыі і аказалі, па меншай меры, такі самы ўплыў на фармаваньне нацыяналізму, што і выбух мадэрнізацыі, які адбыўся 200 з гакам





гадоў таму. Да ліку іх адносяцца розныя антрапалягічныя стылі паводзінаў, лінгвістычныя і сацыяльна-псыхалягічныя асаблівасьці, рэлігія, вясковая культура, праявы нацыянальнай спэцыфікі ў мастацтве і г.д. На думку Т. Нэйрна, мы можам нават спорт прылічыць да ліку дадзеных фактараў. "Калі краіны, якія не дасягнулі яшчэ стадыі нацыяналізму, маюць тэндэнцыю да набыцьця спэцыфічных абрысаў пры дапамозе багоў, плямённай прыналежнасьці, вясковых мітаў і тэрыторыі, то іхныя сучасныя спадкаемцы адчуваюць падобнае ўзьдзеяньне з боку спартовай ідэнтыфікацыі і суперніцтва" (11).

На наш погляд, тэорыя фактараў, якая прапануецца "прэмадэрністамі", мае шэраг істотных недахопаў. Перш за ўсё, яна ўносіць блытаніну ў дыфэрэнцыяцыю этнасаў і нацыяў. Нягледзячы на тое, што практычна ўсе дасьледчыкі, якія адносяцца да дадзенай школы, прызнаюць, што такая розьніца ёсьць, роўным чынам, як ёсьць розьніца між нацыяналізмам і этнацэнтрызмам, пры дапамозе іхнага канцэптуальнага інструмэнту вельмі складана, калі ўвогуле магчыма, правесьці разьмежавальную лінію між гэтымі зьявамі. Канечне, нараджэньне нацыяналізму на сьвет было абумоўлена фактарамі ня толькі сацыяльна-эканамічнымі, але і духоўнымі, рэлігійнымі і г.д. Але для таго, каб адбыўся такі сынтэз духоўных і матэрыяльных пачаткаў, патрабавалася няўнасьць грамадзкіх патрэбаў, пра якія "прэмадэрнізм" умоўчвае. Яны дэтальна прааналізаваныя ў рамках канкурэнтнага дадзенай плыні накірунку, які разглядае нацыяналізм як магутны і эфэктыўны адказ чалавецтва на выклікі, зь якімі яно сутыкнулася ў працэсе мадэрнізацыі.

## Нацыянальнае пытаньне ў цывілізацыйна-гістарычным кантэксьце

Калі зыходзіць з агульна прызнанага у межах цывілізацыйнага падыходу погляду, што чалавецтва прайшло ў сваім развіцьці тры асноўныя стадыі: здабывальнае, аграрнае і індустрыйнае грамадзтва, мы павінны паспрабаваць прааналізаваць стан культуры і арганізацыі на кожным зь іх, каб адшукаць аб'ектыўныя ўмовы, неабходныя для узьнікненьня і развіцьця нацыяналізму.

***

Орды ці невялікія групы здабывальнага грамадзтва былі надта малымі, каб праблема нацыяналізму магла ўвогуле ў ім выявіцца. Зьмяшаньне групаў час ад часу прыводзіла да мультыкультуралізму нават у невялікіх супольнасьцях. Клёд Леві-Строс, вядомы антраполяг, апісаў жыцьцё адной з такіх ордаў, якая жыве ў джунглях Амазоніі. Культурныя кантакты між групамі былі дастаткова частымі. Аднак, рудымэнтарная прырода палітычнага лідарства і адсутнасьць кадыфікаванай пісьмовай культуры азначала, што праб-

лема ўзаемадачыненьняў палітычнага грамадзтва і культуры (арэна ўзьнікненьня нацыяналізму), зусім адсутнічала. Калі няма ні дзяржавы, ні фармальнага ўсталяваньня, пытаньне – якая культура апякуецца дзяржавай праз сыстэму адукацыі – ня можа быць пастаўлена ў прынцыпе.

Нацыяналізм можа ўзьнікаць у да-аграрных грамадзтвах толькі пры ўмове, што яны дажылі да сучаснасьці. Тэрыторыі, на якіх палявалі, лавілі рыбу ці займаліся зьбіральніцтвам прымітыўныя народы, будучы вялікімі, часта ўтрымліваюць багатыя прыродныя рэсурсы. Цяпер гэтыя землі ўваходзяць у склад тых ці іншых нацыянальных дзяржаваў. Прымітыўныя плямёны іншы раз выстаўляюць патрабаваньні на частку сваіх былых уладаньняў на правох іхных першых жыхароў. Але, як правіла, іхныя прэтэнзіі не прымаюцца ўладамі, а самі яны выганяюцца з былой радзімы. У некаторых выпадках прадпрымаюцца спробы іхнага поўнага вынішчэньня пры дапамозе войнаў і распаўсюджваньня хваробаў у інтарэсах бесьперашкоднай эксплюатацыі прыродных багацьцяў "захопнікамі". Для абароны сваіх правоў гэтыя народы выкарыстоўваюць "нацыяналізм" у падобнай да сучаснай форме, які, аднак, ня мог узьнікнуць у зьбіральнікаў і паляўнічых самастойна на папярэдніх этапах эвалюцыі.

***

Аграрная эпоха зьяўляецца абсалютна іншай. Яна прывяла да неверагоднага колькаснага росту і распаўсюджаньня людзей па зямной кулі. Рост стаў магчымым з-за вытворчасьці і назапашваньня прадуктаў харчаваньня. Гэта, у сваю чаргу, зрабіла магчымым ускладненьне падзелу працы і сацыяльнай арганізацыі грамадзтва. Апрача эканамічнага падзелу парцы, зьвязанага з тым, што рамяство і гандаль дапоўнілі сельскую гаспадарку, зьявілася і дыфэрэнцыяцыя на так званых "чырвоных" і "чорных" (у тэрміналёгіі Стэндаля). Першыя ўяўлялі сабой групу спэцыялістаў па прымусу і гвалту; другія зьяўляліся экспэртамі па рытуалах, дактрынах, выратаваньні, лячэньні і апасродкаванай сувязі з трансцэндэнтнымі сіламі. Палітычная цэнтралізацыя (дзяржава), хаця і ня стала ўнівэрсальнай зьявою аграрнага грамадзтва, зрабілася шырока распаўсюджанай, магчыма, найбольш прынятай формай палітычнай арганізацыі. Усеагульнай зьвай стала і гіерархічная структура: можна сказаць з поўнай упэўненасьцю, што складанасьць і арганізацыя разьвіваліся паралельна.

У аграрную эпоху дзяржава існавала, па меншай меры, у большасьці грамадзтваў і тое ж самае адбывалася з культурнай дыфэрэнцыяцыяй. Гэта азначала, як падкрэсьлівае Гелнэр, што "пытаньне аб узаемадачыненьнях палітычнай улады і культуры ўзьнялося перад насельніцтвам аграрных краінаў. Іншымі словамі, узьнікла праблематыка нацыяналізму: стала магчымым, каб нехта прапанаваў тэорыю, што легітымным зьяўляецца





тое палітычнае аб'яднаньне, якое ўключае ў сябе толькі чальцоў і нікога апрача чальцоў дадзенай культурнай супольнасьці. Прасьцей кажучы – "Рурытанія для рурытанцаў!" (12). Бадай што першы гэта зрабіў славуты старажытнагрэцкі філёзаф Платон, які ў дыялёгу "Дзяржава" пісаў наступнае:

"Я сьцьвярджаю, што ўсе эліны блізкія адзін да аднаго людзі і знаходзяцца паміж сабой у роднасьці, а для барбараў – яны іншаземцы і чужакі…Калі эліны змагаюцца з барбарамі, а барбары з элінамі, мы скажам, што яны ваююць, што яны па самой сваёй прыродзе ворагі і гэтую іхнюю варожасьць трэба назваць вайной. Калі ж нешта аналягічнае адбываецца паміж элінамі, трэба сказаць, што па прыродзе сваёй яны сябры, але Элада ў гэтым выпадку хворая і ў ёй пануе міжусобіца, і такую варожасьць варта называць раздорам…Ці не будзе ствараемая табой дзяржава (гаворка ідзе пра ідэяльную дзяржаву Платона – заўв. аўтара) элінскай? Так, яна павінна быць гэткай. А ейныя грамадзяне ці не будуць мужнымі і выхаванымі? Зразумела, будуць. Ці не будуць яны любіць усё элінскае, лічыць Эладу радзімай і разам з астатнімі ўдзельнічаць у сьвяшчэнных сьвятах? Без сумніву будуць…Паколькі яны эліны, яны не стануць пустошыць Эладу, альбо падпальваць там дамы; яны не пагодзяцца лічыць у той альбо іншай дзяржаве сваімі ворагамі ўсіх – і мужчын, і жанчын, і дзяцей, а будуць лічыць імі толькі нямногіх – вінаватых у раздоры…" (13).

Але, як мы бачым, у гэтых разважаньнях аб нацыянальным характары ідэяльнай дзяржавы размова не ідзе пра аб'яднаньне пад ейным дахам усіх элінскіх плямёнаў, а гэта не азначае і пастаноўкі праблематыкі нацыяналізму ў поўным аб'ёме. Платон разважае пра ня вельмі маленькі, але і ня вельмі малы горад-дзяржаву, альбо поліс. Ён таксама не прадугледжвае і суцэльнага зьнікненьня канфліктаў і сутыкненьняў паміж рознымі старажытнагрэцкімі дзяржавамі.

Вельмі важным фактарам для ўзьнікненьня праблематыкі нацыяналізму было вынаходніцтва пісьма. Ідэя кадыфікацыі культуры і ейных правілаў і, затым, іхнага распаўсюджаньня па сродках фармальнай адукацыі была ўжо ў наяўнасьці.Такім чынам, зьявіліся патэнцыйныя магчымасьці для людзей быць нацыяналістамі, у канцэптуальным сэнсе гэтага слова. Аднак, хаця нацыяналісты і ня цалкам адсутнічалі, яны ня кідаліся на вочы і, канечне, не дамінавалі ў аграрным грамадзтве. Чаму гэта так?

На думку Гелнэра, існуе некалькі важных прычынаў гэтага. Перш за ўсё, трэба ўзгадаць тое, што аграрныя грамадзтвы заснаваныя на вытворчасьці і захаваньні прадуктаў харчаваньня і адносна стабільнай тэхналёгіі. У сваю чаргу, тэхналягічная стабільнасьць вядзе да стагнацыі. Гэта азначае, што ніякага радыкальнага павелічэньня вытворчасьці прадукцыі пры існым тэхналягічным базісе ня можа адбыцца. Адзіна магчымым зьўляецца павелічэньне такіх фактараў вытворчасьці, як зямля і працоўная сіла, а гэтыя

крыніцы – абмежаваныя тэхналёгіяй і канцавой прыродай рэсурсаў, якія паддаюцца дадзенай тэхналёгіі. Прасцей кажучы, існуе мяжа на магчымы сукупны прадукт, але не на рост насельніцтва, якая азначае, што дадзены тып грамадстваў зьяўляецца "мальтузіянскім".

Патрэба ў працоўнай сіле і бясьпецы прымушаюць іх высока цаніць нашчадкаў, у прыватнасьці мужчынскага роду, а тэхналягічная стабільнасьць абмяжоўвае вытворчы патэнцыял. Сумяшчэньне гэтых дзьвюх тэндэнцыяў вядзе да высновы, якая зрабіла Мальтуса знакамітым: рост колькасьці насельніцтва ў геамэтрычнай прагрэсіі ў спалучэньні з ростам (калі ён увогуле мае месца) сукупнага прадукту ў арыфмэтычнай прагрэсіі, азначае, што грамадства ў цэлым ніколі не адыходзіць ад той кропкі, калі яно аказваецца ня ў стане накарміць усіх сваіх чальцоў і пэрыядычна, у выніку неўраджаеў ці сацыяльнай напружанасьці, сутыкаецца з голадам. Пры гэтым голад ня б'е наўздагад. У аграрных грамадствах людзі галадуюць у строгай адпаведнасьці з сваім сацыяльным паходжаньнем.

У дадзенай сытуацыі правільнай стратэгіяй паводзінаў любой асобы ці групы зьяўляецца клопат аб сваім уласным статусе ці чыне, у рамках пэўнага сацыяльнага ўладкаваньня, а не павелічэньне сукупнага прадукту, бо грамадзкая пазыцыя, становішча чалавека і правы на яго вызначаюць ягоны лёс. Вытворчасьць дадатковай прадукцыі можа толькі выклікаць крадзяжы і падаткі і таму губляе сэнс. Больш простым зьяўляецца шлях ад улады да багацьця, а не наадварот. У сярэднявечнай Гішпаніі была прымаўка, якая сьцьвярджала, што ваеннае мастацтва – гэта хутчэйшы і больш ганаровы шлях да багацьця, чым гандаль. Падобны пункт погляду быў характэрны большасьці аграрных грамадстваў.

Гэтая ісьціна атрымала свёй замацаваньне і ў структуры каштоўнасьцяў, якая абапіраўся на пагардлівым стаўленьні да працы і павазе да гонару. Што азначала гэтае паняцьце для чалавека аграрнага грамадства? Перш за ўсё клопат аб сваім статусе ў спалучэньні з культам агрэсіі і мастацтвам гвалту. Менавіта гэтыя рэчы высока цаніліся правячай элітай, так званым набілітэтам. Гвалт, які прасякаў наскрозь аграрныя краіны, патрабаваў адзінства і легітымізацыі. Яго было лягчэй зьдзяйсьняць, калі ўзброеная група была яўнай, унутрана цэльнай і валодала яснай структурай улады і падпарадкаваньня. Рытуальная і дактрынальная падтрымка дадзеных прынцыпаў выходзіла ад сьвятароў розных узроўняў і рангаў. Такім чынам, складвалася поле супрацоўніцтва "чырвоных" і "чорных", якія падзялілі ўладу ў аграрных грамадствах.

Якія ж адносіны маглі сфармавацца між арганізацыяй і культурай ува ўмовах аграрнай цывілізацыі? На думку Гелнэра, аграрныя грамадствы імкнуліся да падтрыманьня гіерархіі: кожная статусная група і ейныя чальцы рашуча адстойвалі свае правы і прывілеі і імкнуліся як мага больш жорстка аддзяліць сябе ад больш нізкіх саслоўяў, асобныя





прадстаўнікі якіх пры выпадку хацелі заняць месцы, якія ім не падыходзілі. Знаходзячыся на ніжніх пазыцыях у сацыяльнай структуры, групы сельскагаспадарчых вытворцаў таксама былі падзелены гарызантальна на адрозныя адна ад другой вясковыя супольнасьці. Гарызантальная мабільнасьць была абмежавана прывязанасьцю аграрнага насельніцтва да зямлі. Гэта дапамагала падтрымліваць дысцыпліну і парадак, гарантуючы перадачу прыбавачнага прадукту ў рукі землеўласьнікаў. Іншымі словамі, аграрнае грамадства было антыэгалітарным па сваёй структуры і каштоўнасных арыентацыях і гэта істотным чынам адрозьнівае яго ад сучаснага індустрыйнага грамадства.

У гэтай сувязі варта адзначыць, што ідэі некаторых ліберальных мысьляроў і ў першую чаргу, К. Попера аб існаваньні добра распрацаваных і ўкарэненых у сьвядомасьць людзей некаторых аграрных грамадстваў каштоўнасьцяў роўнасьці зьяўляюцца, на нашую думку, вялікім перабольшваньнем. Попер, крытыкуючы антыэгалітарызм Платона, сьцьвярджаў аб наяўнасьці ў дэмакратычных полісах старажытнай Грэцыі шырока распаўсюджаных імкненьняў да роўнасьці і індывідуалізму, якім супраціўляліся кансэрватары і прыхільнікі арыстакратычных прывілеяў. Але, на самой справе ідэі натуральнасьці жорсткага падзелу людзей на касты былі агульным мекаваньньнем у тыя часы, як і ідэя аб тым, што сапраўднай свабодай у полісе валодаў сам поліс (асацыяцыя паўнапраўных грамадзянаў), а не ягоныя асобныя чальцы, не кажучы ўжо пра тых хто не валодаў грамадзянскімі правамі (14).

З усяго вышэйвыкладзенага вынікае, што ў падобных умовах было выгодным заахвочваць культурную дыфэрэнцыяцыю насельніцтва ўнутры асобных краінаў. Яна спрыяла руціннаму функцыянаваньню аграрнага грамадства, якое залежыла ад падтрыманьня складанай сыстэмы рангаў і чыноў. Больш за тое, патрабавалася, каб гэтая дыфэрэнцыяцыя была бачная і адчувальная, знаходзіла сваё выяўленьне ў манэрах паводзінаў, адзеньні, харчаваньні, акцэнце, табу на пэўныя віды ўжываньня і г.д. Гэта абмяжоўвала прэтэнзіі і памяншала рознагалосьсі. Калі сацыяльнае становішча чалавека, ягоныя правы і абавязкі становяцца часткай ягонай душы, ягонага гонару, гэта, канечне, умацоўвае сацыяльны парадак і дысцыпліну.

Культура ў аграрных грамадствах, у асноўным, выконвала ролю вызначальніка сацыяльных межаў унутры дзяржавы. Часам, пануючая эліта размаўляла на мове чужой і незразумелай простым людзям: латыні ў Рымскай і Сьвяшчэннай Рымскай Імперыях, французкай – ў шэрагу краінаў Эўропы і Расіі, польскай ў ліцьвінскіх землях Рэчы Паспалітай, мове "мандарынаў" у Імперыі Цынь. Стандартызаваная культура эліты была ня толькі адрознай ад народнай культуры, але і падкрэслена непадобнай на яе; яна была ня нацыянальнай а "інтэрнацыянальнай" у тым сэнсе, што часьцяком насіла запазычаны звонку характэр і штучна адмяжоўвалася ад сялянскай, "мужыцкай" культуры, да якой

арыстакратыя адмыслова ставілася з пагардай. У сваю чаргу, нестандартызаваная народная культура нават у межах аднаго этнасу была настолькі разнастайнай, што цяжка было казаць пра нейкае адзінства. Кожны невялічкі рэгіён адрозніваўся ад суседніх дыялектамі, звычаямі, характэрнымі прыкметамі вопраткі, ўборамі, танцамі, сьпевамі і г.д. “Інтэрнацыяналізм” культуры пануючай клясы і “шматколернасьць” культуры падуладных групаў насельніцтва былі натуральнымі рысамі аграрнай цывілізацыі.

“Менавіта гэта зьяўляецца галоўнай прычынай таго, чаму нацыяналізм – пункт погляду, што палітычная супольнасьць будзе легітымнай толькі тады, калі аб’яднае ананімных грамадзянаў, якія належаць да адной і той самай культуры – ня мог лёгка распаўсюдзіцца ў аграрным грамадзтве. Ён знаходзіўся ў глыбокай супярэчнасьці зь ягоным асноўным арганізацыйным прынцыпам выражэньня статуснай прыналежнасьці пры дапамозе культуры. Гэтае грамадзтва не было ні мабільным, ні ананімным, але імкнулася да таго, каб утрымліваць сваіх чальцоў на іхных месцах у гіерархічнай сыстэме, якія падкрэсьліваліся культурнымі адценьнямі” (15).

У такіх умовах культурныя адрозьненьні часта выклікалі ці ўзмацнялі палітычную салідарнасьць. Найбольш характэрныя формы палітычных супольнасьцяў аграрнай эпохі былі ці менш культурных межаў – гарады-дзяржавы, вясковыя супольнасьці, плямённыя ўтварэньні – ці ў шмат разоў іх пераўзыходзілі: культурна-разнастайныя імпэрыі, якія ня мелі ніякіх прычынаў, каб абмяжоўваць сваю экспансію ў тым выпадку, калі сутыкаліся зь лінгвістычнымі і культурнымі межамі іншых народаў на сваім шляху. Большасьць дзяржаваў у той час імкнуліся сумяшчаць абодва гэтыя прынцыпы: трансэтнічныя імпэрыі абапіраліся на суб-этнічныя супольнасьці, выкарыстоўваючы апошнія ў якасьці лякальных структураў, якія зьдзяйсьняюць функцыі збору падаткаў, кантролю і мясцовага кіраваньня.

Важным фактарам, які перашкаджаў узьнікненьню нацыяналізму, быў таксама той, што супярэчнасьці і барацьба ў асноўным узьнікалі ня між культурнымі групамі, а ўнутры іх: арыстакратыя вяла бесьперапынныя войны міжсобку, выкарыстоўваючы для гэтых мэтаў сваіх васалаў; сяляне змагаліся за доступ да абмежаваных рэсурсаў; калі ўзброены канфлікт выходзіў за рамкі культурных супольнасьцяў, праблема мовы і этнічнай прыналежнасьці адыгрывалі ў ім вельмі неістотную ролю. Таму і марксысцкая канцэпцыя клясавай барацьбы, і “прэмадэрнісцкая” ідэя барацьбы культурных супольнасьцяў у аграрным грамадзтве, як галоўных лініяў ягонага сацыяльнага падзелу, зьяўляюцца ў значнай ступені вынікам неабгрунтаванага пераносу і накладаньня сучасных праблемаў на тыя ўмовы.

Усё гэта, канечне, не азначае, што культура ў аграрную эпоху ня мела ніякага палітычнага значэньня. Гэта ня так, бо менавіта яна была індыкатарам вэртыкальных межаў





між статуснымі групамі. У той самы час, культура не адыгрывала істотнай ролі і была амаль незаўважнай пры вызначэньні гарызантальных, ці дзяржаўных межаў. У некаторых выпадках культура выступала важным фактарам ідэнтыфікацыі людзей. Напрыклад, старажытныя грэкі былі, па выразе Гелнэра, культурнымі шавіністамі, якія ясна ўсьведамлялі свае адрозьненьні ад барбарскіх народаў і ганарыліся перавагай над імі. Але гэта не прывяло да палітычнага аб’яднаньня Элады. Гвалтоўна навязаная элінізаванай Македоніяй грэцкім полісам адзіная дзяржава вельмі хутка распалася. Можна бачыць некаторыя зародкі нацыяналізму і ў Старажытным Ізраілі, дзе ўнікальная і патэнцыйна ўнівэрсалісцкая рэлігія, па меншай меры, для таго часу, мела культурна адрозную ад іншых і выключную кліентэлу.

Бліжэй да сучаснай эпохі, у XV ст. сфармаваўся прота-нацыянальны гусісцкі рух, які паўплываў на станаўленьне чэскага нацыяналізму. Аднак у Багеміі і Маравіі рэлігійныя межы між гусітамі і вернымі каталікамі перамяжоўваліся зь лінгвістычнымі і культурнымі. Тое ж самае можна сказаць і пра рух пратэстанцкай рэфармацыі ў цэлым. Выступаючы зь ідэямі зьнішчэньня шматлікага слоя пасярэднікаў між чалавекам і Богам, спрашчэньня абраднасьці царкоўнай службы, данясеньня слова боскага до кожнага верніка на зразумелай яму мове, пратэстантызм спрыяў умацаваньню ідэнтыфікацыі людзей з роднай ім культурай і разьвіцьцю літаратурнай мовы, але ў некаторых выпадках ён прывёў да ўзьвядзеньня новых канфэсійных бар’ераў унутры этнічных супольнасьцяў.

Перадумовы нацыяналізму фармаваліся і ў ВКЛ, шматнацыянальнай і полiканфэсійнай дзяржаве. У ім была ўведзена дзяржаўнасьць старабеларускай мовы, разьвівалася адукацыя і кнігадрукаваньне і, што асабліва важна, быў створаны адзін зь лепшых у Эўропе тых часоў прававы кодэкс. Напісаны па-старабеларуску, ён стымуляваў інтэграцыйныя працэсы ўнутры адукаваных слаёў грамадзтва. Але, зноў такі, нельга толькі на падставе гэтага сьцьвярджаць аб нацыянальным характары дадзенай дзяржавы. Гэта зьяўляецца нацяжкай і спробай разглядаць тое становішча скрозь прызму сучасных уяўленьняў. Існаваньне нацыянальных дзяржаваў было ў прынцыпе немагчымым для той эпохі. У XVI ст. нікому і ў галаву не магло прыйсьці высоўваць патрабаваньне: “ВКЛ для ліцьвінаў!”.

Бясспрэчна, што пэўны ўнёсак у справу нацыянальнага будаўніцтва ўнесла бюракратыя, асабліва ў Рымскай і Кітайскай імпэрыях, зацікаўленая ў наяўнасьці культурна-гамагеннага падуладнага насельніцтва. Э. Сьміт, аналізуючы адносіны між бюракратыяй і нацыяналізмам, указвае: “Як і іншыя вялікія арганізацыі, бюракратычная дзяржава заўсёды ананімная і рацыянальная. Яна мае справу са статыстычнымі катэгорыямі, і ейны raison d’ktre абыякавы да лёсу асобы… У адрозьненьне ад іншых вялікіх арганізацы-

яў, бюракратычная дзяржава лічыць неабходным інтэграваць усіх сваіх чальцоў у аднародную і нават аднастайную масу. Нягледзячы на палітычнае ўсьведамленьне каштоўнасьцяў культурнага плюралізму, тэндэнцыя бюракратыі ўнутры дзяржавы накіравана ў процілеглым накірунку. Законы і ўказы павінны быць добра зразумелымі ўсімі і аднастайнымі; павінны справядліва прадстаўляцца паслугі па сацыяльным забесьпячэньні; інфармацыя павінна распаўсюджвацца паўсюль, а палітычныя правы і паслугі – быць адкрытымі для ўсіх. Дзяржава павінна дзейнічаць у адпаведнасьці з прынятымі ці навязанымі правіламі, якія распаўсюджваюцца на ўсіх грамадзянаў на падставе агульных каштоўнасьцяў. Для гэтай мэты карысная будзе агульная мова, ці, па меншай меры агульная “канцылярская мова”... Адсюль адбываецца рост “палітычнай культуры”, у якой агульны гістарычны досьвед адлюстроўваецца на фармаваньні агульных каштоўнасьцяў і арганізацыяў, якія дапамагаюць інтэграваць розныя сацыяльныя і культурныя групы” (16). Развіцьцё бюракратыі ў пэрыяд абсалютызму і фармаваньня цэнтралізаваных апаратаў кіраваньня ў Эўропе XVII—XVIII стст., бясспрэчна, можа разглядацца ў якасьці важнейшай умовы для ўзьнікненьня праз прыкладна сто гадоў магутных нацыянальных рухаў у гэтым рэгіёне плянэты.

Такім чынам, у аграрную эпоху і асабліва на апошніх этапах яе існаваньня складаліся толькі перадумовы нацыяналізму, але ня сам нацыяналізм, бо “ў аграрным сьвеце культурная аднароднасьць не зьяўляецца палітычнай сувязьзю, а палітычныя сувязі не патрабуюць культурной арнароднасьці” (17). Усё гэта карэнным чынам зьмянілася з уступленьнем чалавецтва ў эпоху індустрыялізму.

***

Індустрыяльная эпоха, у якой жыве сучаснае чалавецтва, адрозьніваецца ад аграрнай цэлым шэрагам істотных характарыстык. Перш за ўсё, індустрыйная цывілізацыя грунтуецца на эканамічным росьце і развіцьці навукі і тэхнікі, а не на стабільным тэхналягічным базысе. Тэмпы эканамічнага росту значна выпярэджваюць тэмпы прыросту насельніцтва, што здымае праблему, пастаўленую ў свой час Мальтусам. Індустрыйны сьвет не зьяўляецца больш “мальтузіянскім”. Мяняецца і форма палітычнай легітымізацыі: той рэжым мае права на праўленьне, які можа забясьпечыць не стабільнасьць як раней, а істотны эканамічны рост. З гэтага вынікаюць важныя сацыяльныя наступствы: дамінуючай тэндэнцыяй сучаснага грамадства становіцца сацыяльная мабільнасьць і імкненьне да роўнасьці.

Калі раней у аграрным грамадстве больш разьвітымі краінамі былі тыя, якія дэманстравалі няроўнасьць і сацыяльную стабільнасьць, то ў сучасным усё адбываецца наадварот. Алексіс дэ Таквіль першым зьвярнуў на гэта ўвагу яшчэ ў XIX ст., зрабіўшы вывад





Согласно ст. 27 Федерального закона “О свободе совести и религиозных объединениях”, ограничение прав объединений, действующих “на данной территории” менее 15 лет, допустимо только после их перерегистрации, которая может быть проведена в любое время до конца 1999 года. При этом закон не содержит прямых указаний на необходимость подтверждения наличия соответствующего срока при перерегистрации централизованных религиозных организаций, которые, следовательно, могут быть перерегистрированы и в случае их существования на протяжении менее 15 лет. Однако на практике региональные управления юстиции и органы прокуратуры трактуют закон по-своему, запрещая общинам производить, приобретать, экспортировать, импортировать и распространять литературу и иные материалы религиозного назначения, заниматься религиозным образованием, приглашать иностранных граждан. Имеют место требования обязательной и незамедлительной перерегистрации до наступления установленного законом срока (конца 1999 года). Местные религиозные организации лишаются возможности получить регистрацию в региональных управлениях юстиции со ссылкой на необходимость предварительной перерегистрации в Москве их централизованного управления, что совершенно незаконно.

24.02.98 прокуратурой г. Абакан Республики Хакасия внесено представление религиозному объединению христиан веры евангельской “Прославление” по поводу якобы имевших место “грубейших нарушений Федерального закона “О свободе совести и





религиозных объединениях”, допускаемых религиозным объединением”. В качестве “грубейших нарушений” указываются, например, проведение церковью собраний в пансионате ветеранов, распространение религиозной литературы, существование библейской школы, приглашение на богослужения иностранных пасторов. В действительности вся названная в представлении деятельность церкви закону не противоречит.

Аналогичные претензии предъявлены 26.01.98 прокуратурой Ярославской области христианскому центру “Новое поколение” в связи с осуществлением продажи верующим книг и брошюр религиозного содержания (что, по мнению прокуратуры, отныне ярославским протестантам запрещено), функционированием студий аудио- и видеозаписи и даже открытием странички в Интернете (что также нельзя). Областная прокуратура указывает, что “в отделе юстиции документа, подтверждающего существование Центра “Новое поколение” на территории Ярославской области не менее пятнадцати лет не имеется”, хотя в официальных разъяснениях по применению нового закона, распространенных Министерством юстиции России, поясняется, что доказательством наличия 15-летнего срока могут быть не только официальные справки органов регистрации, но и показания свидетелей, судебные решения и другие документы. Однако официальные комментарии федеральных ведомств на местах игнорируются.

Новый закон, вводящий временной 15-летний ценз для полноправного существования религиозного объединения, ориентирует чиновников на расправу с Истинно-православной церковью, Российской православной свободной церковью, приходами Русской православной церкви заграницей и Украинской православной церкви. Поражение в правах ожидает в ближайшее время более 200 ныне зарегистрированных общин, альтернативных Московскому патриархату.

Так, подвергся разгрому с применением насилия по отношению к верующим приход Богоявленского собора в г. Ногинске Московской области. С помощью отряда ОМОНа община была изгнана из собора, находящегося в юрисдикции Украинской православной церкви, восстановленного силами прихожан. В пользу РПЦ властями в Ногинске изъято десять зданий, построенных за счет общины Украинской церкви, захвачено церковное имущество и даже скот. 29 сентября 1997 года отряд милиции ворвался в собор, где совершал служение его настоятель архиепископ Адриан. Милиционеры избили одного из священников, на архиепископа надели наручники.

В с. Павловское Суздальского района Владимирской области епархиальное начальство Московского патриархата, пользуясь поддержкой областной администрации, предприняло незаконные действия по изъятию здания церкви Иоанна Предтечи, находящейся в пользовании общины Российской православной свободной церкви (РПСЦ). Игнорируя охранный договор, официально заключенный в 1995 году с общиной РПСЦ,

Министерство культуры РФ и Госкомимущество издали совместное распоряжение о передачи здания церкви Владимирской епархии РПЦ, ссылаясь при этом на обращение архиепископа Евлогия (РПЦ), поддержанное администраций Владимирской области.

Типичным примером политики субъектов Федерации в отношении православия служит Распоряжение мэра Москвы от 18 сентября 1997 года № 733-РМ, согласно которому полностью освобождается от арендной платы за землю одна только Патриархия. На остальные религиозные объединения (как православного, так и иного вероисповедания) эта льгота не распространяется.

Симбиоз светских и церковных властей приводит к небезуспешным попыткам клерикализации системы государственного образования. В ряде регионов (например, в Курской, Смоленской областях) вводится обязательное преподавание православного вероучения в государственных и муниципальных средних школах.

Некоторые религиозные объединения, пережившие преследования в годы советской власти, вновь подвергаются репрессиям по тем же основаниям и с теми же обвинениями, что и в 60-е – 80-е годы. При этом игнорируется тот факт, что и Свидетели Иеговы, и пятидесятники, и баптисты – “инициативники”, и кришнаиты, пострадавшие от коммунистического режима, официально реабилитированы по действующему российскому закону как жертвы политических репрессий и даже имеют соответствующие льготы, установленные для данной категории граждан. 31 марта 1998 года заместитель начальника Управления внутренних дел г. Прохладный Кабардино-Балкарской Республики вынес официальное предостережение руководителю местной религиозной общины Свидетелей Иеговы В.Г.Григорьеву о необходимости прекратить религиозную деятельность общины (названной в официальном документе “сектой”). Религиозную практику Свидетелей Иеговы названный представитель руководства городской милиции расценил как “мелкое хулиганство”.

Отрицая принцип равенства религиозных объединений перед законом, региональные органы власти допускают грубое нарушение фундаментальных прав человека, основных принципов международного права. 10 ноября 1997 года Курчатовским городским судом Курской области Виталий Гущин, принадлежащий к религиозному объединению Свидетелей Иеговы, был осужден к лишению свободы сроком на один год и шесть месяцев за отказ проходить срочную военную службу по религиозным убеждениям. 25 декабря 1997 г. судебная коллегия по уголовным делам Курского областного суда оставила данный приговор без изменений. Как значится в решении суда, “Гущин является сектантом, в связи с чем его доводы о религиозных убеждениях, мешающих ему служить в армии, признаются несостоятельными”.

За счет средств Государственной Думы, в официальном парламентском “Аналитическом вестнике” в марте 1998 года печатается материал “Религиозная экспансия против России”, доказывающий, “что деятельность деструктивных религиозных организаций представляет национальную угрозу, ибо влечет за собой разрушительное воздействие ... на самую целостность государства”. К числу таких организаций государственные аналитики относят действующие на Дальнем Востоке южнокорейские пресвитерианские церкви, Общество сознания Кришны, Свидетелей Иеговы, Новоапостольскую церковь. В качестве доказательства разведывательной деятельности “деструктивных сект” приводится, например, “факт задержания сотрудниками ФСБ Ульяновской области пастора Новоапостольской церкви, который проник через проем в заборе на территорию одной из воинских частей”.





Представляется весьма опасной антирелигиозная по сути своей деятельность, осуществляемая под видом борьбы за “традиционные ценности” официальными лицами, в том числе занимающими высокие государственные посты. Так, заместитель губернатора Омской области А. Казанник (бывший Генеральный прокурор России) публикует в местной прессе материалы, направленные на разжигание религиозной нетерпимости. В статье “Проблемы этнонациональной безопасности Омской области” (газета “Регион-плюс”, декабрь 1997 года) Казанник, в частности, пишет:

“Насаждение в России совершенно чуждых русскому национальному самосознанию и русскому образу жизни вероучений не обошло стороной и Омскую область. ... В результате их деятельности происходит распад русской нации, набирает силу процесс формирования противостоящих друг другу социальных групп, объединяемых по конфессиональному принципу. ... Россия с ее тысячелетней культурой, верой отцов и исконными социальными ценностями не нуждается в зарубежных миссионерах, в их деятельности по духовному “просвещению” наших сограждан”.

Так в общем виде обстоят дела с действительной реализацией декларируемого Конституцией принципа религиозной свободы в нашем демократическом светском государстве.

## Каментар рэдактара

Думкі а. Глеба Якуніна пяцігадовай даўніны пра становішча ў Расіі, асабліва актуальныя для нас якраз цяпер. “Збліжэнне заканадаўства” Беларусі і Расіі прыводзіць, у прыватнасці, да таго, што ў нашай талерантнай краіне прыняты аналагічны закон, які груба парушае правы рэлігійных меншасцяў. Гэты закон – “О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь “О свободе вероисповеданий и религиозных организациях”, падпісаны А.Лукашэнкам 31 кастрычніка 2002 г. Яскравым сведчаннем

атмасферы варажнечы, якая нагняталася ў час праходжання праекту да стадыі зацвярджэння, з'яўляецца разбурэнне храма Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы ў пасёлку Пагранічны. Церпяць і канфесіі, якія сотні гадоў існуюць на беларускай зямлі.

Дакументы, экспертныя заключэнні, ініцыятывы грамадскіх арганізацый, палеміка вакол гэтага няўдалага, на думку многіх, беларускага законатворчага акту – абагульненыя ў выданні Грамадзянскай ініцыятывы "За свабоднае веравызнанне":

Белая книга. Материалы по проекту Закона Республики Беларусь "О свободе совести и религиозных организациях", (составитель Я. Басин). Минск, 2002 (243 с.).

*В.Ф. Голубеў,*
кандыдат гістарычных навук

# КАНФЕСІЙНАЯ ПАЛІТЫКА Ў БЕЛАРУСІ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Тэрмін "палітыка" (ад грэцкага *politiká* – дзяржаўныя ці грамадскія справы) азначае дзейнасць у сферы адносін паміж сацыяльнымі групамі людзей, нацыямі, дзяржавамі. Пад тэрмінам "канфесійная палітыка" у нашым артыкуле мы будзем разумець, у першую чаргу, адпаведную дзейнасць дзяржавы, яе ўладных структураў ў сферы дачыненняў з рэлігійнымі канфесіямі як сацыяльнымі інстытутамі, а таксама ўзаемадачыненні з групамі насельніцтва ці асобамі, якія спавядаюць тую ці іншую рэлігію.

Беларусь гістарычна склалася як поліэтнічная (з перавагай беларускага этнасу) і поліканфесійная краіна. Былі перыяды, калі тут ў якасці "асноўнай" канфесіі ўсталёўвалася то праваслаўе, то каталіцызм, то пратэстантызм, у часы камуністычнага рэжыму нават панаваў "ваяўнічы атэізм". Канфесійная сітуацыя ў Беларусі, як правіла, адлюстроўвала ўсе праблемы сацыяльна-палітычнага жыцця. Канфесіі часта самі аказвалі прама ці апасрэдавана ўплыў на ўнутраную і знешнюю палітыку краіны Улады, у сваю чаргу, імкнуліся схіліць царкву ці касцёл на свой бок, выкарыстоўвалі супярэчнасці паміж канфесіямі для правядзення сваёй палітыкі. Разам з тым, яшчэ ў часы феадалізму кіраўнікі краіны зразумелі важнасць таго, каб быў захаваны баланс у міжканфесійных адносінах і адносінах па лініі дзяржава – канфесіі. Як сведчыць гісторыя, парушэнне такога балансу ніколі не было карысным ні людзям, ні рэлігійным арганізацыям, ні дзяржаве. Таму мы паспрабуем не толькі прааналізаваць сучасную канфесійную сітуацыю ў краіне, але і зрабіць кароткі агляд гісторыі канфесійнай палітыкі ў Беларусі з часоў Полацкага княства да нашых дзён, звяртаючы ўвагу на тое, як гэтая палітыка ўплывала на агульны стан грамадства і дзяржаўнага будаўніцтва.

Нельга сказаць, што дзяржаўныя і палітычныя дзеячы сучаснай Рэспублікі Беларусь не разумеюць далікатнасці канфесійнага пытання. Так, засцерагаючыся ад магчымага супрацьпастаўлення грамадзянаў Беларусі, у тым ліку і па канфесійных пытаннях, жа-

даючы не дапусціць у будучыні нават самай малой мажлівасці прыцяснення любой палітычнай, сацыяльнай ці канфесійнай групы ці асобы, якая належыць да гэтых групаў, ўсталявання партыйнай, сацыяльнай альбо рэлігійнай манаполіі, ці ператварэння іх ідэалогіі ў дзяржаўную, улічваючы гістарычны вопыт і традыцыі грамадскага і духоўнага жыцця беларусаў, яшчэ ў 1994 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь ўключыў у Канстытуцыю наступны тэкст: “Ідэалогія палітычных партый, рэлігійных або іншых грамадскіх аб”яднанняў, сацыяльных груп не можа ўстанаўлівацца ў якасці абавязковай для грамадзян”. Без змяненняў гэтая фармулёўка ўвайшла і ў тэкст Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь рэдакцыі 1996 г. [1, с. 5].

Але сёння з’явілася шмат прыкметаў, якія сведчаць на тое, што гэтае палажэнне Канстытуцыі можа быць парушана на карысць толькі адной канфесіі, а менавіта праваслаўя. Так, насуперак таму, што Асноўны закон зафіксаваў свецкі характар беларускай дзяржавы, вышэйшы чыноўнік пастаянна называе сваю краіну праваслаўнай. Больш за тое, улады адкрыта заявілі, што яны зрабілі выбар на карысць аднаго канкрэтнага веравызнання. Сапраўды, праваслаўе ў Беларусі самая шматлікая канфесія. Але ў дэмакратычных рэжымах роўнасць у правах не вызначаецца колькасцю вернікаў ці прыхільнікаў! У адносінах з дзяржавай усе канфесіі, як і ўсе грамадзяне, арганізацыі, партыі павінны мець роўныя правы.

Такім чынам, размову пра ўплыў канфесійнай сітуацыі на ўнутранае становішча грамадства Беларусі прыходзіцца весці ў даволі складаны час, калі ўлада пайшла па шляху шчыльнага супрацоўніцтва толькі з адной з распаўсюджаных у Беларусі канфесій. У першую чаргу маецца на ўвазе завяршэнне працэса падрыхтоўкі пагаднення аб супрацоўніцтве паміж дзяржавай і Беларускай праваслаўнай царквой. Пасля прыняцця новага варыянта закона “Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях” адбылося тое, ад чаго засцярагала дэмакратычная частка беларускага грамадства: дзяржава выбрала адну, лепшую для сябе канфесію і аддае ёй прыярытэт у параўнанні з іншымі канфесіямі ва ўсіх сферах грамадска-палітычнага (і не толькі) жыцця. На нашую думку, такія дзеянні не адпавядаюць часткі першай артыкула 16 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, дзе сказана: ”Рэлігіі і веравызнанні роўныя перад законам” [1, с. 8].

Несумненна, што заключэнне вышэйзгаданага пагаднення прывядзе да змены канфесійнай сітуацыі ў краіне, можа выклікаць (і ўжо выклікае) пэўную нязгоду як з боку прадстаўнікоў “неправаслаўных” канфесій, так і ўвогуле з боку людзей дэмакратычных перакананняў незалежна ад іх веравызнання. Так, удзельнікі грамадзянскай ініцыятывы “За свабоднае веравызнанне” выказалі пратэст як супраць унясення зменаў у закон “Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях”, якія, на іх думку, значна абмяжоўваюць правы іншых, акрамя праваслаўнай, канфесій, так і супраць самой практыкі яго прыняцця – без усенароднага абмеркавання, без уліку заўваг прадстаўнікоў канфесій, з дэманстратыўнай пагардай да грамадскай думкі. На жаль, закон ў вышэйзгаданым выглядзе і вышэйзгаданым чынам быў прыняты. На думку ўдзельнікаў ініцыятывы “За свабоднае веравызнанне”, своеасаблівае разуменне дзяржаўнымі чыноўнікамі “дзяржаўных інтарэсаў” “аказалася вышэйшым за здаровы сэнс, а ў выніку, як гэта было ўжо мноства разоў, правы асобы былі адкінутыя, каб дагадзіць інтарэсам дзяржавы. А інтарэсы дзяржавы сёння, як мы разумеем, ляжаць у сферы стварэння новай дзяржаўнай ідэалогіі, дзеля чаго ў нас на вачах (без малейшай сарамлівасці і агляднкі на ўласную Канстытуцыю) усталёўваецца дзяржаўная рэлігія” [2, с. 1].





Дарэчы, стаўка ўладамі робіцца на царкву, якая ў цяперашнім стане не можа па вызначэнню праводзіць уласнабеларускую дзяржаўную і нацыянальную палітыку. Так, Беларуская праваслаўная царква не з’яўляецца царквой нацыянальнай, а ёсць толькі рэгіянальная частка Рускай праваслаўнай царквы (РПЦ) і, натуральна, што праводзіць яна канфесійную (і не толькі) палітыку, якая выпрацоўваецца не ў Мінску, а ў Маскве. Беларускім уладам, відаць, больш да спадобы “дзяржаўніцкія” падыходы РПЦ. Яна амаль заўсёды выступала і выступае на баку ўладаў, у Расійскай імперыі яе кіруючы орган (Сінод) быў адным з дзяржаўных міністэрстваў і працаваў на свецкія ўлады. Да беларускай сітуацыі поўнасцю падыходзіць расійскае тлумачэнне адносін РПЦ і дзяржавы: “У расійскай традыцыі менавіта дзяржава з’яўляецца кансалідуючай і вызначальнай сілай, а таму “згода з традыцыяй” не дапускае таго, што Царква можа быць свабоднай асацыяцыяй веруючых грамадзян (па прынцыпу: ад дзяржавы ніхто не свабодны) і тым больш якой-небудзь апазіцыяй, нават духоўна-маральнай. Наадварот, Царква ўяўляецца як шчырая супрацоўніца моцнай дзяржавы, і ўсе яе магчымыя прэтэнзіі зводзяцца да недапушчальнасці абмежавання яе нацыянальна-культурных і дзяржаўніцкіх “правоў” і “прывілеяў” [18].

Заўважым і тое, што змена канфесійнай сітуацыі адбываецца падчас актывізацыі працэсаў уключэння Беларусі ў склад Расійскай Федэрацыі праз так званую “саюзную дзяржаву”. Зусім верагодна, што канкардат беларускіх уладаў з праваслаўнай царквой ёсць спроба аказаць яшчэ большы ўціск на свядомасць насельніцтва, ўлічваючы рэзкае зніжэнне колькасці грамадзян, што жадаюць уступіць у саюз альбо аб’яднацца з Расіяй. Важным паказчыкам палітыкі ўладаў у рэлігійным пытанні таксама з’яўляюцца рэпрэсіўныя дзеянні супраць любых памкненняў прадстаўнікоў іншых цэркваў ствараць незалежныя, уласнабеларускія канфесійныя арганізацыі, ці тыя, якія маюць свае цэнтры не ў Расіі (Беларуская праваслаўная аўтакефальная царква, пратэстанцкія абшчыны і да т.п.). Да прыкладу, святар Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы Іван Спасюк, які доўгі час змагаўся за незалежную беларускую царкву, вымушаны быў пасля пагрозы

быць асуджаным “за распальванне рэлігійнай варожасці”, з’ехаць з краіны і папрасіць палітычнага прытулку ў ЗША [3].

Дарэчы, пагадненне, ці дагавор царквы са свецкімі ўладамі зусім не вынаходніцтва праваслаўя ці беларускіх уладаў. Тут Беларусь і праваслаўная царква проста скарысталі і “творча перапрацавалі” каталіцкую традыцыю *канкардата* – пагаднення паміж папам рымскім як кіраўніком каталіцкай царквы і ўрадам пэўнай дзяржавы аб становішчы каталіцкай царквы ў гэтай краіне, яе правах і прывілеях. Для нас значную цікавасць уяўляе тое, што пачынаючы з XIX ст. такія пагадненні вельмі часта заключаліся Ватыканам у асноўным з дыктатарскімі ці аўтарытарнымі рэжымамі: канкардат 1801 г. папы Пія VII і Напалеона І; канкардат 1847 г. з Расіяй; канкардат 1929 г. з урадам Мусаліні; канкардат 1933 г. з урадам гітлераўскай Германіі; канкардат 1953 г. з урадам Франка ў Іспаніі [4, с. 145]. Менавіта таму беларускі варыянт дагавору “улады-праваслаўе” таксама падштурхоўвае на пэўныя аналогіі.

Разам з тым, нельга забываць, што гісторыя нашай краіны ўжо мае шмат прыкладаў умяшальніцтва дзяржавы ў канфесійныя справы. Улічваючы тое, што гісторыя ёсць настаўніца жыцця, што разумныя людзі вучацца на чужых памылках, паглядзім, якія ж вынікі давала аб’яднанне (ці, больш лагодна саюз, унія) дзяржавы з той ці іншай канфесіяй. Факты сведчаць, што ў пераважнай большасці выпадкаў гэта прыводзіла да стварэння напружанай сітуацыі ў грамадстве і негатыўна ўплывала на працэсы этнічнага, а потым і нацыянальнага самавызначэння.

Паспрабуем разглядзець асноўныя падзеі такога кшталту ў іх гістарычнай дынаміцы на тэрыторыі Беларусі, іх уплыў на ўнутрыпалітычнае становішча дзяржавы, а потым, з улікам гістарычнай традыцыі, звярнуцца да сучаснасці.

Атрымалася так, што пасля падзелу хрысціянства (1054 г.) на заходнюю і ўсходнюю часткі, большасць тэрыторыі сучаснай Беларусі гістарычна апынулася ў сферы ўплыву “візантыйскай версіі” хрысціянства. Заходнехрысціянскія ўплывы пранікалі на тэрыторыю Беларусі праз місіянераў, гандлёвыя і эканамічныя сувязі з заходнееўрапейскімі краінамі. У 1250-я гады адбылося першае прызначэнне рымскага-каталіцкага біскупа для часткі беларускіх і літоўскіх зямель, калі вялікі князь Міндоўг прыняў каталіцкае хрышчэнне і каралеўскую карону.

Пранікненне хрысціянства на беларускія землі, аднак, не азначала, что адразу і аўтаматычна большасць насельніцтва краіны сталіся яго прыхільнікамі. Паганства было распаўсюджаным не толькі ў Жмудзі. Нават у Полацкім княстве, дзе была ўтворана ў 992 г. першая ў Беларусі епархія, побач з хрысціянамі жылі язычнікі, у прыхільнасці да апошніх летапісцы падазравалі і знакамітага полацкага князя Усяслава. Аб тым, што сельскае насельніцтва магло яшчэ доўга зберагаць язычніцтва і не ведаць хрысціянства,





сведчыць, на думку некаторых гісторыкаў, нязначная колькасць храмаў і манастыроў, якія ў гэты час у асноўным знаходзіліся ў гарадах [5, с.11].

Не сакрэт, што царква ў даўнія часы адыгрывала ролю своеасаблівага ідэалагічнага інстытуту і выконвала, між іншым, функцыю ідэалагічнай падтрымкі ўладаў. Гэта добра разумелі першыя гаспадары (вялікія князі) Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (ВКЛ) і менавіта таму імкнуліся ці выкарыстаць пэўнае спаборніцтва паміж праваслаўем і каталіцызмам на гэтых землях, ці спрабавалі стварыць самастойныя канфесійныя цэнтры на тэрыторыі сваёй краіны, альбо абаперціся на старое язычніцтва. Так, напрыклад, вядома, што сыны вялікага князя Кейстута, як і сыны Альгерда ад Улляны Цвярской, пры жыцці бацькоў не былі ахрышчаны. Таму некаторыя гісторыкі лічаць, што Гедымін (1316—1341 гг.) імкнуўся надаць язычніцтву дзяржаўнае значэнне, аб чым ускосна сведчыць перанос сталіцы дзяржавы з Навагрудка ў Вільню, у цэнтры якой знаходзілася язычніцкае капішча [5, с. 12]. Вядома і тое, што і Гедымін і Альгерд (1345—1377 гг.) імкнуліся да стварэння незалежнай праваслаўнай мітраполіі ў ВКЛ.

Рэлігія можа аб’яднаць, а можа і пасварыць грамадства, можа садзейнічаць кансалідацыі нацыі, а можа і раскалоць яе. Такія прыклады ёсць і ў беларускай гісторыі. Так, прыняцце Крэўскай уніі 1385 г. і рэалізацыя яе асноўных палажэнняў рэзка змяніла канфесійную сітуацыю ў ВКЛ. Калі вялікі князь Ягайла выдаў 20 лютага 1387 г. прывілей з шырокімі правамі толькі для феадалаў каталіцкага веравызнання [6, с. 101—102] і пачалася палітыка дзяржаўнай падтрымкі каталіцызму, ігнаравання “русінаў”, якія складалі 80% насельніцтва ВКЛ, праваслаўныя феадалы выказалі рэзкую незадаволенасць такой палітыкай вярхоўных уладаў. Некаторыя даследчыкі, у прыватнасці вядомы беларускі філосаф Сямён Падокшын, лічаць, што ў гэты час менавіта ў барацьбе супраць рэлігійна-прававой дыскрымінацыі праваслаўных беларуска-украінскіх феадалаў, упершыню ў грамадскім жыцці ВКЛ быў сфарміраваны моцны апазіцыйны рух на чале з Вітаўтам, Андрэем Полацкім, Свідрыгайлам і інш. [7, с. 18]. Зусім верагодна, што якраз у гэты час у значнай частцы беларускага грамадства пачало фармавацца разуменне сваёй праваслаўнасці і адсюль беларускасці, усведамленне сябе як прыгнятаемай групы, з імкненнем абараніць свае правы. Канфесійнае супрацьстаянне перарасло ва ўзброены супраціў (унутраная вайна 1432—1436 гг.). Вайна насіла адкрыты характар супрацьстаяння двух частак грамадства: каталікоў і праваслаўных. Заўважым, што барацьба гэтая ў асноўным тычылася вярхушкі грамадства. Сялянства, якое складала больш за 90% насельніцтва, часта нават не разумела пра што спрачаецца эліта. Дзейнічаў просты прынцып: “якой веры пан, такой веры і халоп”. Аднак паступовае ўцягванне насельніцтва ў міжканфесійную і, такім чынам і палітычную барацьбу не прыводзіла да кансалідацыі нацыі. Узброенае супрацьстаянне прывяло да таго, што ў 1432 г. Княства нават аказалася падзе-

леным на дзьве часткі – Літву і Русь: "И Литва же посадиша великого князя Жигимонта Кесьтутевич на великое княжение на Вилни и на Троцех месяца сентября 1 день. И приде Швидригайло на Полотескь и на Смоленскь, и князи руськыи и бояре посадиша князя Швидригайло на великое княжение на Руское" [8, с. 57].

Справа скончылася тым, што кароль Уладзіслаў-Ягайла 15 кастрычніка 1432 г. выдаў прывілей, па якому прызнавалася палітычнае раўнапраўе праваслаўных і каталікоў. Некалькі пазней, 6 мая 1434 г. падобны прывілей спецыяльна для ВКЛ выдаў вялікі князь Жыгімонт Кейстутавіч [6, с. 119—121]. Гэта быў першы агульнадзяржаўны прывілей, які абвяшчаў раўнапраўе русінаў і літоўцаў у ВКЛ, праваслаўныя народы з каталікамі атрымалі гарантыі недатыкальнасці сваіх зямельных уладанняў, свабоду распараджэння зямлёй і да т.п. Свідрыгайла яшчэ спрабаваў выкарыстаць канфесійную карту ў сваім змаганні і выступіў з ідэяй царкоўнай уніі. Але пасля выдання прывілея 1434 г. колькасць яго прыхільнікаў пачала змяншацца і ў выніку Свідрыгайла пацярпеў паразу [9, с. 98—99]. Правільная канфесійная палітыка ўладаў на пэўны час усталявала ў дзяржаве адносны спакой і парадак.

Канечне, згаданыя вышэй падзеі не былі апошнім прыкладам супрацьстаяння ў грамадстве на канфесійнай глебе. Нават вядомы мяцеж князя Міхала Глінскага 1508 г. праходзіў пад заявамі аб неабходнасці бараніць праваслаўе і праваслаўных.

Нежаданне кіраўніцтва ВКЛ мець пастаяннае супрацьстаянне ў грамадстве паміж рознымі канфесійным групамі, як і разуменне таго, што падтрымка любой адной канфесіі аўтаматычна паставіць прадстаўнікоў другой у апазіцыю да ўладаў, прывяло да таго, што ўжо з пачатку XVI ст. у краіне пачала праводзіцца дзяржаўная палітыка, заснаваная на роўнасці феадалаў ВКЛ, незалежна ад іх этнічнага паходжання, ці канфесійнай прыналежнасці. У 1563 г. вялікі князь і кароль Жыгімонт Аўгуст выдаў дэкрэт, які абвясціў поўную грамадзянскую роўнасць каталіцкай, праваслаўнай і пратэстанцкай шляхты ВКЛ. Нават нягледзячы на тое, што пасля Люблінскай уніі 1569 г. аб'ектыўна пазіцыі праваслаўных павінны былі пагоршыцца, сітуацыя захоўвалася даволі стабільнай, таму што за суверэнітэт ВКЛ і свае правы вялі барацьбу праваслаўныя магнаты ВКЛ. Больш за тое, роўнасць правоў ўсёй шляхты "веры хрысціянскай" было заканадаўча афармлена ў галоўным законе краіны – Статуце 1588 г. [10, с. 112—114].

Увогуле, утвораная ў 1569 г. Рэч Паспалітая ўяўляла ў тагачаснай Еўропе, якая была падзеленая рэлігійна і культурна, вельмі своеасаблівую дзяржаву. "У абсягу гэтай дзяржавы больш-менш у роўных прапорцыях апынуліся тэрыторыі, звязаныя з заходне- і ўсходнееўрапейскім культурным узорам. Не было другой такой краіны ў Еўропе, дзе існаваў бы падобны стан рэчаў. Мяжа паміж заходне- і ўсходнееўрапейскім культурным прасцягам праходзіла цяпер не ўздоўж дзяржаўных межаў, як гэта мела месца ў сярэднявеччы, а ў абсягу адзінай дзяржавы, заходняя частка якой традыцыйна мела культурную лучнасць з лацінскай Еўрпопай (ужо з X стагоддзя, а ў выпадку Летувы з XIV стагоддзя), а ўсходняя частка з візантыйскай Еўропай, і таксама з X стагоддзя. Гэта быў фактар, які бясспрэчна абцяжарваў функцыянаванне дзяржавы і быў вытокам унутраных канфліктаў, але адначасова ён быў вельмі карысны для ўзаемнага культурнага збліжэння падзеленай паводле гэтай адзнакі Еўропы" [11, с. 320].





Значны ўплыў на фармаванне самасвядомасці беларусаў і ўвогуле на дзяржаўнае будаўніцтва маглі зрабіць ідэі Рэфармацыі і Адраджэння. Рэфармацыя, як барацьба за чысціню каталіцкай царквы прыйшла ў Беларусь у выглядзе пратэстантызму, у асноўным у форме кальвінізму. Прыхільнікі кальвінізму ў ВКЛ выступалі за набажэнствы на роднай мове, за незалежнасць ВКЛ у супрацьвагу палітыцы каталікоў на замацаванне каталіцызму ў Княстве і паступовую інкарпарацыю ВКЛ у склад Рэчы Паспалітай. Рэфармацыя ў Беларусі (1553—1596 гг.) не змагла стаць як у некаторых краінах Еўропы агульнанацыянальным рухам, а ахапіла толькі вышэйшыя слаі грамадства – магнатаў і частку гараджанаў. Здавалася, што пратэстантызм зможа стаць аб'яднаўчай ідэяй хоць бы для эліты грамадства. Прыклад таму давала дзейнасць канцлера ВКЛ Мікалая Радзівіла Чорнага, быў актыўнага прыхільніка пратэстантызму, з дапамогай якога ён імкнуўся аб'яднаць грамадства, абараніць краіну ад ідэалагічнага ўплыву Польшчы і Масквы. Першапачаткова такая палітыка мела пэўны поспех. Толькі ў сваіх уладаннях ён зачыніў 187 касцёлаў і адчыніў 134 кальвінісцкіх зборы [12, с. 400—401]. Да 60-х гадоў XVI ст. у кальвінізм перайшла большасць беларускіх праваслаўных магнатаў. Гісторыя дала беларусам чарговы шанец выпрацаваць нацыянальную ідэалогію, атрымаць канфесію, якая зможа аб'яднаць грамадства і будзе незалежнай ад канкурыруючых рэлігійных цэнтраў суседзяў.

Але шанец гэты не быў скарыстаны. Моцны ўдар па пратэстантызму нанесла дзейнасць ордэна езуітаў, якая насіла аткрыта пракаталіцкі характар. Некаторыя гісторыкі з гэтай прычыны выказваюць думку, што замест тэрміна "контррэфармацыя" больш дакладна было б ужываць выраз "каталіцкая Рэфармацыя" [14, с. 235]. Ворагамі каталіцкай царквы былі аб'яўленыя і пратэстанты (дысідэнты) і праваслаўныя (схізматыкі).

Контррэфармацыя, якая пачалася ў ВКЛ ў 70-я гады XVI ст., стала часткаю агульнаеўрапейскага працэсу. Але ў Беларусі яна мела свае асаблівасці. Тут контррэфармацыя парушыла прынцып верацярпімасці і не дапусціла стварэння нацыянальнай пратэстанцкай царквы. Праваслаўная знаць, якая прыйшла ў свой час у пратэстантызм, потым у большасці сваёй перайшла ў лона каталіцкай царквы. Але ў гэты ж час справу выпрацоўкі агульнадзяржаўнай ідэалогіі і стварэння агульнанацыянальнай рэлігіі паспрабавала ўзяць у свае рукі дзяржава. Грамадству, ужо з боку дзяржавы, альбо з яго адкрытай

падтрымкай была прапанавана ідэя аб'яднання (уніі) каталіцкай і праваслаўнай цэркваў на тэрыторыі ВКЛ. Адзначым, што, на наш погляд, напачатку гэтая ідэя не выклікала актыўнага супраціву ні з боку феадалаў-каталікоў, ні з боку феадалаў-праваслаўных. Але пазней стала ясна відаць, што пасля уніі 1596 г. пазіцыі праваслаўя яшчэ больш пагоршыліся.

Супраціў такой канфесійнай палітыцы прывёў да таго, што ў 1633 г. кароль Уладзіслаў IV запэўніў праваслаўных у рэлігійнай свабодзе і аб'явіў аб стварэнні праваслаўных епархіяў з цэнтрамі ў Луцку, Львове, Перамышлі і Магілёве [5, с.15]. Але найбольшага напружання міжканфесійнае змаганне дасягнула пад час так званай казацка-сялянскай вайны 1648-1651 гг. і вайны з Маскоўскай дзяржавай 1654—1667 гг. Прынесены звонку канфлікт прывёў да змяншэння колькасці насельніцтва Беларусі з 2 млн. 876 тыс. чал. у 1650 г. да 1 млн. 352 тыс. чал. у 1667 г. Агульныя страты насельніцтва склалі 53% [13, с. 92]. Больш за тое, з гэтага моманту пачаўся ўнутраны канфлікт у краіне паміж праваслаўнымі, каталікамі і часткова пратэстантамі, які так і не знайшоў свайго завяршэння.

Тое, што ў 1685 г. Кіеўская мітраполія аказалася падпарадкаванай Маскоўскаму патрыярхату, прывяло да больш значных дзеянняў ураду і грамадства Рэчы Паспалітай, як і насельніцтва Беларусі на карысць уніяцкай царквы. Унія бачылася, як калісьці пратэстантызм, асновай для стварэння незалежнай ад Масквы канфесіі, магчымасцю неяк нейтралізаваць па-маскоўскаму зарыентаванае праваслаўе. Уплыў уніяцтва асабліва пашыраўся на тэрыторыях, дзе пераважала праваслаўнае насельніцтва. "Яшчэ нядаўна асуджаная на поўнае вынішчэнне Уніяцкая Царква ў апошняй трэці XVII ст. вырасла колькасна, умацнілася ўнутрана і на мяжы XVII—XVIII стст. нягледзячы на моцнае супрацьдзеянне звонку, стала самай масавай канфесіяй у Беларусі" [15, с. 12—13].

Спроба пазбегнуць дыялогу з некаталіцкімі канфесіямі з боку кіраўніцтва Рэчы Паспалітай і правячай каталіцкай царквы, адмова на сейме 1766 г. даць роўныя правы некаталікам (пратэстантам і праваслаўным) нанесла велізарныя страты дзяржаве, не садзейнічала аб'яднанню, а яшчэ больш раз'ядноўвала беларускую нацыю, тармазіла працэсы нацыянальнага самавызначэння. Адмова ад канфесійнай роўнасці прывяла да стварэння ў 1767 г. Торуньскай пратэстанцкай і Слуцкай праваслаўнай канфедэрацый, якія пачалі шукаць падтрымкі за мяжой, што прывяло да ўмяшальніцтва іншаземцаў ва ўнутраныя справы краіны, а потым і да падзелаў Рэчы Паспалітай.

Але XVIII – пачатак XIX стст. сталі для Беларусі часам, калі сама аснова нацыянальнай самасвядомасці моцна пахіснулася. Спачатку, прыкладна з сярэдзіны XVII ст. беларусы штучна аказаліся падзеленымі на прапольскую каталіцкую шляхту і "людзей простага стану" – праваслаўных ці уніятаў. Эліта нацыі зрабіла выбар на карысць больш моцнай польскай культуры і больш магутнага каталіцызму. Простае насельніцтва не магло нават





вызначыцца, хто яно ёсць па веры, якая пад уплывам тых ці іншых фактараў часта мянялася, і па паходжанню, часта называючы сябе проста мясцовым насельніцтвам, "тутэйшымі".

Падобны крызіс адбыўся і напрыканцы XVIII ст., калі Беларусь была інкарпаравана ў склад Расійскай імперыі. (Па падліках літоўскіх даследчыкаў, на 1791 г. колькасць уніятаў у ВКЛ складала 39% ад агульнай колькасці насельніцтва, каталікоў – 38%, праваслаўных – 6,5%, іўдзеяў – 10%, старавераў – каля 4%, мусульмане, пратэстанты і караімы складалі разам каля 2%. Каля 80% сельскага беларускага насельніцтва было ўніяцкім [5, с. 16].

Напачатку рускі урад на далучаных землях Беларусі праводзіў даволі асцярожную палітыку, у тым ліку і ў канфесійнай сферы і дазволіў дзейнаць усіх канфесій. Але вельмі хутка царызм пачаў ператвараць на расійскі капыл канфесійную арганізацыю на тэрыторыі былога ВКЛ, імкнучыся зрабіць царкоўныя структуры разнавіднасцю расійскага дзяржаўнага апарата.

Разам з тым, стаўка (як і цяпер у Рэспубліцы Беларусь) была зроблена на праваслаўе. Дзеля гэтага ўлады нават пайшлі на скасаванне уніяцкай царквы ў 1839 г. Мінусам для беларускага этнаса ў гэтым выпадку стала тое, што ўсе праваслаўныя (у тым ліку і былыя уніяты) былі аб'яўленыя "рускімі". Хаця былыя ўніяцкія прыхажане пэўны час захоўвалі рэшткі уніяцкай самасвядомасці, з цягам часу яны змірыліся са сваім праваслаўем (апошні моцны пратэст сялян-уніятаў – паўстанне 1863 г.). Адзначым, что большасць эліты ізноў выбрала больш моцную дзяржаву і больш магутную рэлігію.

Пасля падаўлення паўстання 1863 г. палітыка царызму на беларускіх землях прыняла жорсткую накіраванасць на замацаванне тут толькі ўсяго рускага, у тым ліку і "рускай" веры – праваслаўя. Праваднікам такой палітыкі павінна была выступіць праваслаўная царква, і ўлады стварылі ёй для гэтага ўсе магчымасці. "Калі на пачатку XIX ст. ішоў працэс завяршэння ўвядзення праваслаўнай царквы ў апарат кіраўніцтва, дык у канцы стагоддзя яно ўжо мела там даволі трывалыя пазіцыі. Клерыкалізацыя закранула ўсю ўнутраную палітыку самадзяржаўя. Праваслаўная царква аказвала вялікі ўплыў на усе бакі жыцця расійскага грамадства, з'яўляючыся апорай самадзяржаўя. Яе статус падтрымліваўся з дапамогай спецыяльных законаў" [16, с. 71].

З прыходам да ўлады ў кастрычніку 1917 г. бальшавікоў становішча ўсіх канфесій у грамадстве карэнным чынам змянілася. Пачалася доўгая, палітая крывёю многіх пакаленняў святароў і вернікаў канфрантацыя дзяржавы і царквы. Савецкая ўлада нават не змагла зразумець чаму так хутка адрадзілася царкоўнае жыццё на акупаванай пад час Другой сусветнай вайны тэрыторыі. І ізноў, замест таго, каб выкарыстаць патэнцыял канфесій і вернікаў на стварэнне, улады працягвалі праводзіць палітыку на забарону і згортванне рэлігійнай дзейнасці.

І толькі з пачатку 1990-х гадоў, з пачаткам перабудовы і дэмакратызацыі адбыліся некаторыя змены бальшавіцкіх стэрэатыпаў на становішча і ролю канфесій у жыцці грамадства і дзяржавы. Пасля атрымання Беларуссю незалежнасці ў нашай краіне ў снежні 1992 г. быў прыняты закон "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях", які вызначыў новыя прынцыпы адносін дзяржавы да рэлігіі. "Яны заключаюцца ў тым, што дзяржава бярэ на сябе шэраг абавязкаў, звязаных з прызнаннем існавання і дзейнасці рэлігійных арганізацый, садзейнічае ўстанаўленню адносін цярпімасці і павагі паміж грамадзянамі, якія вызнаюць рэлігію ці не вызнаюць яе, рэлігійнымі арганізацыямі розных веравызнанняў, а таксама паміж іх паслядоўнікамі. Абвяшчаючы аддзяленне царквы ад дзяржавы, закон надае царкве сапраўдную самастойнасць, прызнае за ёй надзейнае месца ў жыцці грамадства, а таксама падкрэсліавае, што дзяржава не ўскладае на рэлігійныя арганізацыі выкананне якіх-небудзь дзяржаўных функцый, не ўмешваецца ў дзейнасць рэлігійных арганізацый, калі яна не супярэчыць заканадаўству" [с. 318—319]. Сёння да гэтых словаў можна дадаць: "Так было..."

На жаль, акадэмічныя працы пазбягаюць разгляду канфесійнай палітыкі ў сучаснай Беларусі, гістарычнага ўплыву канфесійнага фактару на працэсы нацыянальнай самаідэнтыфікацыі беларусаў. Вось адзінае, што на гэты конт мы знайшлі ў главе "Этнічнае развіццё беларусаў у навейшы час" акадэмічнага выдання Інстытуту мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі пад назвай "Беларусы. Вытокі і этнічнае развіццё": "Вялікую ролю ў ладзе жыцця, духоўным абліччы народа іграла рэлігія. Найбольшы ўплыў на беларусаў мела праваслаўе. Другое займала каталіцкая вера. Поліканфесіянальны характар рэлігійнага светаўспрымання беларусаў вызначаў асаблівасці іх этнічнай самасвядомасці"[17, с. 420]. Яно як-быццам і так. Але ж гісторыя этнічнага і канфесійнага жыцця беларусаў і доўгая і зусім не такая адназначная, як падаюць яе акадэмічныя і афіцыйныя даследчыкі. Акрамя таго, што не толькі каталіцызм і праваслаўе ўплывалі на працэсы нацыянальнай самаідэнтыфікацыі белаорусаў, дык і вышэйзгаданыя канфесіі не заўсёды займалі аднолькавае месца ў жыцці беларускага грамадства, як відаць хаця б з прыведзеных намі фактаў.

Хацелася, каб у нашай краіне захаваўся той розум і тая разважлівасць, якія былі прыналежнасцю нашых продкаў. На нашую думку, уладам неабходна пазбягаць любой спакусы "выбраць" сабе спрыяльную канфесію, набыць ў яе асобе падтрымку і "выдаць" людзям "правільную" ідэалогію. Пасварыць прасцей. Мірыць цяжка. Самае разумнае – азірнуцца ў сваю гісторыю і павучыцца ў сваіх продкаў. Працытуем некаторыя палажэнні Артыкула "Аб захаванні ў спакоі ўсіх падданых нашых жыхароў гэтай дзяржавы з боку рознага разумення і ўжывання набажэнства хрысціянскага" Статута ВКЛ 1588 г.: "... А так як у Рэчы Паспалітай існуе немалая рознасць у адносінах веры хрысціянскай, папярэджваючы, каб з гэтай прычыны паміж людзей сутыкненні якія-небудзь шкодныя не пачаліся, якія ў іншых каралеўствах мы ясна бачым, абяцаем тое сумесна за нас і за нашчадкаў нашых на вечныя часы пад абавязкам прысягі, пад вераю, гонарам і сумленнем нашым, што мы, якія з'яўляемся рознымі ў веры, мір паміж сабой захоўваць, а ў сувязі з рознасцю веры і адрозненняў ў цэрквах крыві не праліваць і не караць адбіраннем маёмасці, пазбаўленнем гонару, турэмным зняволеннем і выгнаннем. І ніякаму вяршэнству, ні ураду, да такіх паступкаў ніякім чынам не дапамагаць, а наадварот, дзе б хто яе праліваць хацеў, з той прычыны будзем бараніцца, пра тое будзем абавязаны хаця б пад страхам асуджэння, ці за якім-небудзь судовым дзеяннем, хто б яго не хацеў учыніць" [10, с. 113]. На гэтым Статуце прысягалі вялікія князі ВКЛ, карацейшы, але па зместу падобны тэкст ёсць у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь... Ці дадасца гістарычны вопыт?

Хацелася б адзначыць, што пакуль не было празмернага ўмяшальніцтва дзяржавы ў справы канфесій у грамадстве быў спакой і здаровае спаборніцтва. Значна змяніліся адносіны асноўных канфесій да Беларусі і беларускага этнасу. Пачалі праводзіцца набажэнствына нацыянальнай мове, адносіны да прыхажаніна сталі адносінамі да верніка, а не да патэнцыяльнага прыхільніка "тытульнай" для канфесіі дзяржавы. Калі канфесіі больш былі з людзьмі, чым з уладамі, гэта бачылі і цанілі людзі. На жаль, зараз яны бачаць іншае, а менавіта спробу буйнейшай канфесіі стаць афіцыйна-дзяржаўнай, з аднаго боку, і імкненне ўладаў найсці сабе "духоўную" падтрымку і дапамогу "у разуменні" насельніцтвам неабходнасці аб'ядноўвацца з адзінаверным усходнім суседам, з другога.

Ці не пра цяперашнюю Беларусь гэтыя словы: "Такім чынам, у наяўнасці імкненне дзяржавы, умацоўваючы "уладную вертыкаль", усталяваць эфектыўны кантроль і над рэлігійнымі працэсамі ў грамадстве. Наўрад ці гэта прывядзе да рэцыдыву "савецкай" рэлігійнай палітыкі. Сёння сітуацыя іншая: два аўтарытарызмы – царкоўны і свецкі – ідуць насустрач адзін аднаму" [18].

## Літаратура


1. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Мінск, 1997.
2. Белая книга. Материалы по проекту закона "О свободе совести и религиозных организациях". Минск, август 2002.
3. Белорусская деловая газета, 21 марта 2003 г., № 41.
4. Рэлігія і царква на Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. Мінск, 2001.
5. Філатава А. Канфесійная гісторыя Беларусі (ад Вялікага княства Літоўскага да Рэспублікі Беларусь) // Гісторыя Беларусі ў еўрапейскім кантэксце. Матэрыялы гістарычных семінараў, якія адбыліся ў Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры ў 2001 г. Мінск, 2002.
6. Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 1. Минск, 1959.

7. Падокшын С.А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура. Мінск, 1998.
8. Полное собрание русских летописей. Т. 35, М., 1980.
9. Сагановіч Г. Нарыс гісторыі Беларусі. Мінск, 2001.
10. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. Мінск, 1989.
11. Падраза А. Гістарычныя перадумовы развіцця культуры на землях колішняй Рэчы Паспалітай // Быць або ня быць сярэднееўрапейцам. Сучаснае польскае мысленьне. Менск, 2000.
12. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. Ч. І. Са старажытных часоў да канца XVII ст. Курс лекцый. (І.П. Крэнь і інш.). Мінск, 2000.
13. Карпачёв А.М., Козловский П.Г. Динамика численности населения Белоруссии во второй половине XVII-XVIII в. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы 1968 г. Ленинград, 1972.
14. Косман М. Кальвіністы ў культуры Вялікага княства Літоўскага. Адметныя элемэнты й чужыя ўплывы // Быць або ня быць сярэднееўрапейцам. Сучаснае польскае мысленьне. Менск, 2000.
15. Марозава С. Дзейнасць Уніяцкай Царквы па кансалідацыі беларускага народу. Берасце-Гродна, 2001.
16. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII—XX ст.). Мінск, 1998.
17. Беларусы. Т. 4. Вытокі і этнічнае развіццё. Мінск, 2001.
18. Кырлежев А. Церковь и мир: парадокс или синтез? // Русская мысль, Париж. 1—7 июня 2000, № 4320.

# Змест

Ад рэдактара ........ 3

*Уладзімер Роўда.* Канцэпцыя паходжаньня нацыяналізму ........ 5
*Антон Слонимский.* Характерные особенности и препятствия в развитии малых предприятий Беларуси ........ 28
*Леанід Лыч.* Змагаўся за Айчыну – спачывае на чужыне ........ 53
*Аляксей Хадыка.* Роская мастацкая калекцыя ........ 63
*Глеб Якунин.* О праве человека на свободу совести в современной Росии ........ 70
*Валянцін Голубеў.* Канфесійная палітыка ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць ........ 85

**Філаматы**
**Бюлетэнь Рэспубліканскага грамадскага аб’яднання**
**«Таварыства аматараў ведаў (філаматаў)»**

Выдаецца з красавіка 1999 года.
Для ўнутранага карыстання ў грамадскай арганізацыі.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Галоўны рэдактар Юрый Хадыка
Макет Зміцера Коласа

Падпісана да друку 28.03.2003. Фармат 62х84 1/16. Гарнітура Гарамонд.
Друк рызаграфічны. Ум. друк. арк. 5,75. Наклад 299 асобнікаў. Заказ .

Адрас рэдакцыі: 220012 Мінск, вул. Талбухіна, 17–16. Тэл./факс (017) 266-07-97
Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка ў друкарні
УП «Ходр» ГА БелТІЗ, 220013, Мінск, вул. Вызвалення, 9.